БЕЛАРУСЬ СВЯТОЧНАЯ

ГУЛЬНЁВЫ ПАДВОРАК



БЕЛАРУСЬ
СВЯТОЧНАЯ

Гульнёвы *падворак*

Мінск
"Красіка-Прынт"
2001

УДК 339.17 (476)
ББК 65.9 (4 Бел) 421
Г 94

Укладальнік **К.Л. Лабчэўская**

Серыя "Беларусь святочная" заснавана ў 2000 годзе
Рэдактар **Л. І. Жук**

Г 94 Гульнёвы падворак / Пад рэд. Л.І. Жук. — Мн.: Выд. ТАА "Красіка-Прынт", 2001. — 128 с. — (Беларусь святочная)

ISBN 985-405-082-3.


У кнізе прадстаўлены шэраг творчых распрацовак гульнёвых праграм усіх каляндарных цыклаў. Сабраны цікавы народны гумар, а таксама шмат забаўляльных гульняў.

Выданне адрасавана работнікам культуры пазашкольных і школьных устаноў, а таксама масаваму чытачу.

УДК 339.17 (476)
ББК 65.9 (4 Бел) 421

ISBN 985-405-082-3

© К.Л. Лабчэўская, 2001
© ВТАА "Красіка-Прынт", 2001



Падворкі пяцідзесятых гадоў збіралі дзяцей розных узростаў. Асабліва летам яны напаўняліся радаснымі галасамі. Далёка было чуваць: “Кацілася торба з высокага горба. А ў той торбе хлеб, пшаніца. З кім ты будзеш дзяліцца?” “Аты-баты, шлі салдаты, аты-баты, на базар. Аты-баты, што купілі? Аты-баты, самавар. Аты-баты, колькі стоіць? Аты-баты, тры рубля. Аты-баты, хто выходзіць? Аты-баты, гэта я.” І да самай цемры гулялі ў “Хованкі”, “Жмуркі”, “Квача”, “Пікара”, “Гарады”, “Два, трэці лішні”, “Гусі-лебедзі”. А вясною, як толькі сыдзе снег, на сухой частцы двара з’яўляліся “Класы”. Малявалі іх па правілах чорным вугальком ці “запазычанай” у школе белай крэйдай. Скакалі на адной назе, не стамляючыся, некалькі гадзін. Даражылі, каб не

выключылі з гульні, бо завадатарамі былі па чарзе ўсе. Спачатку абгаворвалі ўмовы гульні, спрачаліся, згаджаліся і гулялі. Адкуль да нас гэтыя гульні прыходзілі? Тэлевізар на весь пасёлак быў адзіны, кніжак з гульнямі не было, але ж, калі на летнія канікулы мы ездзілі ў вёскі і другія гарады да сваякоў, заўсёды ў свой двор прывозілі нешта "новенькае". Мае сяброўкі кожны год з Украіны і Масквы, Літвы і Латвіі гулялі ў падобныя як з нашага двара. Там, як і ў нас, бегалі за колам з ровара ці каляровай вяртушкай, ці запускалі караблікі і крычалі радасна: "Вунь мой самы вялікі!", "Глядзіце, а мой хутчэй, спрытней паплыў!" Дарослыя з павагай ставіліся да гульнёвых спраў сваіх дзяцей. Успамінаю, што на нашым падворку заўсёды збіраліся суседзі. Жанчыны прыходзілі са сваім вышываннем. Пасядаюць адна каля другой, спачатку раяцца, які колер "мулінэ" падабраць да свайго ўзору. Але не вышывалі ўсе адзін і той жа ўзор, адна ў адной пераймалі, і былі гэта: "украінкі", "букеты"... і называліся чамусьці смешна: "макалькі". Мужчыны ўладкоўваліся на другім баку двара. Ігралі ў карты, даміно, была ў іх адна спрэчка вакол палявання ці рыбалкі. Не памятаю, каб хто вымаўляў дрэнныя словы. Усе гамонкі дарослых былі пабудаваныя на нейкай весялосці, радасці сустрэчы. А сустрэчы былі кожны дзень.

Суседзі пасля працы кожны дзень збіраліся, каб пабыць разам. Застоллі наладжваліся толькі на вялікія святы, ці калі спраўлялі хрэсьбіны ці вяселле. Тады дарослыя спявалі песні, і ў нас была свая любімая: "То березка, то рябина, куст ракиты над рекой, край родной, навек любимый, где найдешь еще такой..."

Гульнёвы падворак дзяцінства! Чым больш прыбаўляецца гадоў, тым з асаблівай цеплынёй ён успамінаецца. Сёняшнія гульні таксама перадаюцца ад аднаго дзесяцігадовага хлопчыка да другога.

З 1972 года мне даводзілася быць на Усесаюзных конкурсах культарганізатараў. Пятнаццаць рэспублік прымала ўдзел і паказвала свой прафесійны ўзровень. І там я заўважыла, што некаторыя гульні вельмі падобныя, што з Кіргізіі, што з Літвы,



што з Грузіі ці Расіі. А ў 1990 годзе была ў Балгарыі, дзе вядучая з Турцыі запрасіла нас развучыць танец-гульню"Ойра". Потым прадстаўнікі з Латвіі, Расіі і Беларусі сказалі, што і ў іх гэтая гульня запісана ў фальклорных зборніках. Італьянцы паказалі танцавальную гульню пад назваю "Скопа", а яна як свая, толькі з рознымі назвамі, прыжылася ў Літве, Латвіі, Беларусі. Хто аўтар гульні? Ніхто не адкажа на гэтае пытанне.

За шматгадовыя назіранні я зразумела на практыцы, што гульня не мае межаў, ёй не перашкаджае разнамоўе. Яна пералятае з адной краіны ў другую без пашпарта. Кожны, хто з'яўляецца арганізатарам гульні, уносіць свой уклад, а хто ў яе гуляе - свой. Імправізацыя дапамагае ёй аднаўляцца; людзі, якія перадаюць гульню, уносяць нешта сваё.

У нас на Беларусі добрымі прапагандыстамі гульнёвай дзейнасці былі: метадыст рэспубліканскага Дома народнай творчасці, а потым выкладчык мінскага вучылішча Астапук Васіль Максімавіч; культарганізатар санаторыя "Крыніца" Макушына Раіса Пятроўна, кіраўнікі гуртоў гульні "Скамарохі" Валаховіч Святлана Анатольеўна, Дзіско Ганна Герцыкаўна. На жаль яны пайшлі з жыцця, але ж многа зрабілі на карысць развіцця гульнёвай творчасці. Мне вельмі хочацца, каб іх імёны былі знаёмы вам, тым, хто возьме ў рукі гэтую кнігу.


Вы зразумелі, што я - не аўтар, а збіральніца. Назбірала гульняў і пацешак і шчыра запрашаю на свой падворак пагуляць.

Не ведайце стомы
На працы і дома
Нясіце гульнёвы настрой!
Каб дзеці смяяліс,
Каб усе мы ядналіс
На Радасць!
На Шчасце!
Дабро!
І Любоў!

Клаўдзія Лабчэўская



Зімою





Новы год на плошчы



Напярэдадні Новага года на плошчах гарадоў і пасёлкаў з'яўляюцца лясныя прыгажуні-ёлкі. У некаторых мясцінах стала традыцыяй сустракаць тут Новы год. Танцы і гульні вакол ёлкі з удзелам Дзеда Мароза, Снягурачкі і іншых казачных персанажаў любяць і дарослыя, і дзеці.

Прапануем некалькі рухавых зімовых гульняў.

"Збі каўпак снегавіка"

Кожны ўдзельнік кідае тры снежкі ў каўпак снегавіка. Перамагае каманда, якая большую колькасць разоў трапіла ў каўпак.

"Марозка"

Колькасць удзельнікаў - 10-30 чалавек. Пры дапамозе лічылкі, якую гаворыць вядучы, выбіраюць "Марозку" і разбягаюцца па пляцоўцы. "Марозка" бяжыць за імі і стараецца дакрануцца да каго-небудзь рукой. Той, да каго ён дакрануўся, лічыцца "замарожаным", павінен спыніцца, развесці рукі ў бакі і не рухацца. Іншыя ўдзельнікі могуць "размарозіць" яго, пляснуўшы рукой па плячы.

Праз 3-5 хвілін выбіраецца новы "Марозка". Перамагае "Марозка", які здолее "замарозіць" большую колькасць удзельнікаў гульні.



Выбіраць "Марозку" можна пры дапамозе лічылкі:

Ты зялены,
Ты чырвоны,
Ты ў кажусе
ў цябе
Сіні нос –
Гэта ты,
Дзед Мароз!
Дзед Мароз, Дзед Мароз,
Бабу снежную прынёс,
Баба, баба, снегавуха,
Не хапай мяне за вуха!

"Пошта"

Усе, хто гуляе, становяцца вакол ёлкі ў круг,не трымаючыся за рукі. Кожны вымаўляе выбраную назву беларускага горада ці сяла. Выбіраюць вядучага, завязваюць яму вочы (можна надзець яму вялікі прыгожы каўпак). Ён выходзіць на сярэдзіну круга і называе два гарады ці вёскі. Удзельнікі гульні, якія выбралі гэтыя назвы, павінны памяняцца месцамі: перабегчы ціха, каб той, хто стаіць у крузе, не чуў, дзе перабягаюць, і не злавіў іх. Калі ён зловіць аднаго з тых, хто перабягае, то той становіцца ў сярэдэіну круга. Гульня пачынаецца спачатку.

"Змяя"

Усе строяцца ў калону па аднаму (адзін за адным) і бяруцца рукамі за пояс таго, хто стаіць наперадзе. Уся калона - змяя, першы ў калоне - "галава"; апошні - "хвост".

Па сігналу вядучага "галава" павінна злавіць "хвост", які ад яе ўцякае. "Галава", што злавіла "хвост", пераходзіць у канец калоны, і гульня паўтараецца спачатку.

Усе павінны моцна трымацца рукамі адзін за аднаго, стараючыся не разарваць калону.



Каляды

Сцэнарый святочнага прадстаўлення

Гістарычная даведка.

Каляды (ад лацінскага слова Calendae — калонды—назва першага дня кожнага месяца ў рымлян, ці ад слова кола). Каляды — народнае зімовае свята дахрысціянскага паходжання. У царкоўным календары адзначаецца з 24 снежня па 6 студзеня і звязана з рэлігійным святам нараджэння Хрыста і Вадохрышча. Для абраднасці Каляд характэрны тры абрадавыя вячэры (куцці): посная (вялікая) спраўляецца перад першым днём свята; багатая (тоўстая, шчодрая, мясная) — перад Новым годам. Абавязковымі стравамі на ёй былі бліны з верашчакай і смажанай каўбасой, крупнік з парасяцінай, буракі і г.д. Посная куцця (галодная, вадзяная) спраўлялася перад Вадохрышчам. Абавязковай стравай была ўласна куцця — ячная каша з тоўчаных (не сечаных) ячных круп. У некаторых вёсках яна замянялася пшанічнай. Куцця варылася з цэлых зярнят і была сімвалам бессмяротнасці, вечнасці жыцця. Варылі яе перад заходам сонца і ставілі на покуці. Каштаваць кашу ў час гатавання і перад вячэрай забаранялася, а ў час абрадавай вячэры яе елі апошняй.

Падчас Каляд наладжвалі калядаванне, варажбу, шматлікія забавы, гульні, спявалі калядныя песні, у якіх віншавалі гаспадароў хаты, жадалі ім дабра і заможнасці, услаўлялі іх працавітасць і шчодрасць.

Калядаванне — традыцыйны звычай хаджэння каляднікаў па хатах на Каляды з выкананнем велічальных песень, тэатралізаваных сцэнак з удзелам "казы", "мядзведзя", "кабылы", "жорава" і іншых персанажаў. За гэта калядникам давалі падарункі (сала, каўбасы). З цягам часу калядаванне набыло характар забавы. Напрыклад, адной з забаў было шчадраванне: дзяўчаты хадзілі па хатах са "шчодрай" (прыгожай дзяўчынай), якая была апранута ў святочнае адзенне, а на галаве



ў яе быў надзеты папяровы вянок з рознакаляровымі стужкамі. Дзяўчаты спявалі шчадроўскія песні (шчадроўкі).

Дзеючыя асобы каляднага гурта:
Вядучы-пачынальнік
Дзед-Мароз
Снягурка
Звяздар (хлопец са звяздою)
Шчодра-маладзіца, дзяўчаты
Музыкі (гармонік, скрыпка, бубен)
Жораў, каза, кабыла, мядзведзь
Цыганы, хлопчык-механоша

Маскі, касцюмы, рэквізіт дзеючым асобам патрэбна падрыхтаваць загадзя і з добрым мастацкім густам. Звычай калядавання, а таксама песні, танцы, гульні дайшлі да нас ад нашых продкаў, але трэба, каб з дапамогай касцюмаў яны загучалі па-новаму прыгожа, і свята тады набудзе рысы сучаснасці.

Усе ўдзельнікі каляднага гурта заходзяць у гаспадарчы двор. Грае гармонік, бубен, скрыпка, дзяўчаты пяюць шчадроўкі, прывітальныя калядныя песні, цыганы прытанцоўваюць, каб гаспадары дома, да якога падышлі калядоўшчыкі, пачулі, што да іх ідуць "вясёлыя" людзі і нясуць у хату добры настрой. Вокны ззяюць электрычным святлом. Падрыхтаваныя да сустрэчы гасцей гаспадары запрашаюць усіх у хату. Гучаць песні "Паехала Каляда з канца ў канец", "Добры вечар вам!"

Вядучы-пачынальнік:

Мы хадзілі, гулялі калядоўшчыкі,
Прыхадзілі, прыгулялі к гаспадарскаму двару *(называюцца імёны гаспадароў).*
Гаспадарскі двор на сямі стаўбах,
Стаўбы точаныя, пазалочаныя.

Жораў:

Добры хазяін наш, багаты *(называецца імя гаспадара),*



Прымай гасцей за песеньку,
Ну ж, хазяін, паскарэй
Падары сваіх гасцей!
А не хочаш ты дарыць –
Ідзі з намі сабак дражніць!

(Жораў падскоквае, смешыць прысутных).

Вядучы:

Ну, што ты гаворыш? Яшчэ людзям добрае слоўца не сказаў, а ўжо пачынае дражніць. Паглядзі, як трэба да людзей звяртацца: – Шчодры вечар добрым людзям! *(Кланяецца.)* Ці дома, дома сам гаспадар? *(Называе імя гаспадара.)*

Цыган:

Ой, дома, дома сам пан гаспадар,
Сядзіць ён сабе ў канцы стала.

Цыганка:

Сядзіць? А ці нас ён запрашае?

Гаспадыня:

Запрашаем шчыра вас, добрыя людзі!

Усе садзяцца за стол. Адна "каза" тупае.

Гаспадар:

Гэй, гэй, гэй, каза, гэй, шэрая,
Дзе рогі падзела?

Каза:

На соль праела.

Гаспадар:

Чаго ж так: на соль праела? Дзе ты бачыла тую соль, людзі ў краме ўсю даўно размялі?!

***Каза* (спявае і прытупвае з паказам усіх рухаў):**

Соль дарагая, мера скупая,
Пайшла каза пад тое сяло
Пад Журовічы, пад Буловіцы.
А ў тым сяле жылі тры стральцы,
Стрэлілі казе ў левае вуха.

Бах! Каза лажыцца (падае на падлогу, падымаецца, прытанцоўвае, спяваючы):

Гаспадынечка, весялінечка,



Запалі свечачку да падзі ў клетачку.
Зірні на бачок, там стаіць мачок,
Зірні на паліцу, вазьмі каўбасіцу
тры кускі сала, каб каза ўстала,
мерку аўса, каб каза расла,
мерку жыта, каб каза была сыта.

Да гаспадыні падбягаюць хлопчыкі-механошы, падстаўляюць мех. Гаспадыня кладзе ў яго пачастункі. Граюць музыкі. "Цыганы" запрашаюць гаспадароў танцаваць "Цыганачку". "Мядзведзь" скача разам з усімі, імітуючы рухі ўсіх танцуючых, з усіх смяецца. Пасля танца "цыган" просіць гаспадароў купіць яго кабылу.

Цыган:

Ой, коню, коню, я прадам цябе,
Я прадам цябе (называе імя гаспадара).
Сівы конічак, мал, невялічак,
Хораша ўбраны, добрым аўсом ускормлены!

Гаспадар:

Не! Твой конь тры дні аўса не еў!

Цыган:

А чаму ж не еў?

Гаспадар:

Ну, дакажы, што конь твой спрытны, няхай паскача!

Цыган:

А ну, музыканцікі, урэжце "Лявоніху", а я з гаспадынькай станцую! А ты *(звяртаецца да гаспадара)* запрасі танцаваць маю кабылку! *("Цыган" танцуе з гаспадыняй, прыпяваючы):*

Ах, Лявоніха, Лявоніха мая!
У цябе палова вёскі – кумаўя,
Знала ты, як запрасіць, пачаставаць,
Да рэчы слова добрае сказаць,
Разважыць, і ў смутку звесяліць,
А часамі – і да сэрца прытуліць! (М.Багдановіч)

"Цыган" з гаспадыняй падыходзяць да гаспадара.

Цыган:



Ну што, купляеш кабылу?

Гаспадыня (ласкава паглядаючы, звяртаецца да мужа):

Давай купім!

Гаспадар:

А няхай да маіх "Жыгулёў" яшчэ адна "кабылкіна" сіла стане ў хлеў! *(Дастае з кішэні грошы, лічыць, хоча аддаць "цыгану". У гэты час "жораў" дзёўбае носам "цыгана" і гаспадара.)*

Жораў:

А ты, барадзей, не баў гасцей.
Твае дары невялікія, у дзверы не лезуць.
Ты лепей дай пачынальнічку — мёду чарачку,
Ккаўбаску на талерачцы,
Механошы — жменю грошай,
Цыгану — даляр злоты!

Гаспадар:

Злоты даляр? Толькі за песню прыгажуні "Шчодры"!

Дзяўчаты:

А чаму толькі "Шчодры"? А мы што — горшыя?

Гаспадар:

А таму, што майму сыну-малайцу "Шчодра" прыгледзелася!

(Дзяўчаты бяруць за рукі "Шчодру" і падводзяць да Вядучага.)

Вядучы:

А вось вашаму малайцу і выпрабаванне. Гульня называецца "Вішанька". *(Ставіць табурэтку пасярод хаты і запрашае "Шчодру" стаць на яе.)* Цяпер ты выконваеш ролю "Вішанькі", даю табе саломінку. Умовы гульні такія: на працягу гульні "Вішанька" трымае саломінку ў вуснах, паварочваючы галаву то ў адзін, то ў другі бок. У "Вішанькі" ёсць два адважныя кавалеры, якія ахоўваюць яе. *(Два хлопцы, узяўшыся за рукі, акружаюць "Вішаньку".)* Ну, а твая задача, маладзец-удалец, схапіць вуснамі саломінку ў нашай "Вішанькі". І калі гэта табе ўдасца — "Шчодра" адорыць цябе за гэта пацалункам.

Вядучы пасля заканчэння гульні запрашае ўсіх у круг. Праводзіцца танец-гульня "У карагодзе мы былі".

Хлопцы і дзяўчаты бяруцца за рукі і ўтвараюць карагодны



круг. У сярэдзіне яго ходзіць адна пара і прытанцоўвае, а астатнія рухаюцца вакол іх і спяваюць *(кожны радок паўтараецца двойчы):*

- У карагодзе мы былі,
Ай, люлі, мы былі.
- Каго вы там відзелі,
Ай, люлі, відзелі?
- Мы відзелі парачку,
Ай, люлі, парачку.
- Ты, парачка патанцуй,
Ай, люлі, патанцуй.

Пара, станцаваўшы, выходзіць з карагоднага круга. Іх месца займае іншая пара, якая паўтарае тое ж самае.

Дзед Мароз са Снягуркай **(устаючы з-за стала і звяртаючыся да моладзі):**

Ну, што, паскакаліся, паспяваліся, пачаставаліся? Дык падзякуем добрым і вясёлым гаспадарам!

Віншую з Новым годам,
Святы вечар добрым людзям.
З Новым годам і з усім родам,
з празнічкам, і з каляднічкам.
Першы празнічак — святое Ражаство,
Другі празнічак — святое Хрышчэнне,
Святое Хрышчэнне і Калядам прашчэнне!
Снягурка: Сейся, радзіся,
Жыта, пшаніца,
Гарох, чачавіца.
Расці, пшаніца,
Унізе караніста,
Каб на будучы год
Было болей, упрок.
Штоб усяго было ўволю
І ў амбары, і на полі.
Сею, сею, засяваю,
З Новым годам паздраўляю.
Удзельнікі каляднага гурта развітваюцца з гаспадарамі і з



песняй "На новае лета" выходзяць з хаты.

Свята працягваецца далёка за поўнач ля зялёнай ёлкі. Стварыць атмасферу сучаснага свята вам дапамогуць розныя гульнёвыя сітуацыі, розыгрышы, карагоды, варожбы, песні.

Сцэнарый падрыхтавала К.Л.Лабчэўская

Дадатак да сцэнарыя

1. Песні

Паехала Каляда з канца ў канец.
Каляда, Калядзіца ж мая!
Зайшла Каляда да Андрэя на двор:
- Пане Андрэй, чым даруеш Каляду,
Каляду, Калядзіцу ж маю,
А ці жонкаю, пшонкаю,
Ці маладою Аўдоцькаю?
Паехала Каляда з канца ў канец.
Каляда, Калядзіца ж мая!
Заехала Каляда да Усціна на двор:
- Пане Ўсцін, чым даруеш Каляду,
Каляду, Калядзіцу ж маю,
А ці жонкаю, пшонкаю,
Ці маладою Таццянкаю?
Паехала Каляда з канца ў канец.
Каляда, Калядзіца ж мая!..
Добры вечар таму, хто ў гэтым даму.
Святы вечар!
А ў гэтым даму сам пан хадзяін
За сталом сядзіць, тры кубкі дзяржыць.
У первым кубачку – зеляно віно,
У другім кубачку – кудрава піва,
У трэцім кубачку – мядок саладок.
Зеляно віно – для хадзяіна,
Кудрава піва – для жаны яго,
Саладок мядок – для яго дзяток.



Мы ж цябе, хадзяін, не зневажаем,
Ды з Новым годам паздраўляем.
На новае лета
Радзі, божа, жыта,
Шчодры вячор,
Багаты вячор!
Усяку пшаніцу,
Дай табе, божа,
Пане гаспадару,
Піва варыці,
Сынкоў жаніці,
Гарэліцу гнаці,
Дачок аддаваці.
Залезь на баляску
Дастань каўбаску,
Стань на драбінку
Дастань слаінку,
Кошычак маку
Да таго прысмаку.

Калядная гульнятэка

1. Журавель
2. Горліца
3. Карагод
4. Мароз
5. Сусед і суседка
6. Хустка
7. Жаніцьба Цярэшкі
8. Яшчур

Журавель

Гэта танец-гульня. Яго выканаўцы павольна падымаюць то правую, то левую нагу, імітуючы ўсёй пластыкай свайго цела жураўля. Некалькі пар, узяўшыся за рукі, утвараюць круг.



У цэнтры яго ходзіць хлопец - "журавель". У той час, калі пары кружацца, ён падкрадаецца да дзяўчат і стараецца вырваць якую-небудзь з рук кавалера. А кавалер са сваёй дзяўчынай спрытна выкручваецца. Падчас танца дзяўчаты спяваюць:

Ды ўнадзіўся журавель
Ды да нашых канапель:
Такі-такі журавель,
Што не выгнаць яго нідзель.
Такі-такі чубаты,
Такі-такі насаты!

Нарэшце, калі дзяўчаты закрычаць: "Хапай, журавель!" - ён павінен схапіць каго-небудзь з іх за рукі і станцаваць з ёю адзін круг. Калі ж нікога не схопіць – зноў застаецца ў крузе за жураўля. У выпадку, калі яму пашанцуе, яго месца займае той, хто застаўся без пары.

Горліца

Некалькі пар, узяўшыся за рукі, утвараюць круг. У цэнтры яго з завязанымі вачыма ходзіць дзяўчына. Яна павінна паказаць на хлопца. Калі ж пакажа на дзяўчыну, то павінна пацалаваць хлопца, які быў у той пары. Падчас гульні хлопцы пяюць:

Ой, дзяўчына-горліца
Ды да хлопцаў горнецца,
А хлапчына, як арол,
Як пабачыў - ажно умёр!

Карагод

У гэтай гульні дзяўчаты становяцца ў свой круг, а хлопцы - ў свой. Кругі павінны стаяць адзін у адным. Пад музыку песні С.Палонскага "Карагод" дзяўчаты рухаюцца ў адзін бок, а хлопцы - у адваротны.

***Хлопцы* (пяюць):**

Ідзе, ідзе карагод, карагод,
Усе дзевачкі напярод, напярод,
Дзяўчаты:



А хлопчыкі за намі,
Міргаючы вачамі.
Усе разам:
Ото ж карагод,
Ото ж ваявод.
Дзяўчаты:
У нашага карагода
Быў сын ваявода
Хлопцы:
У нашага карагода
Быў сын ваявода
Усе разам:
Ото ж карагод
Ото ж ваявод.

Мароз

Колькасць удзельнікаў - 10-20 чалавек. Яны пры дапамозе лічылкі:

Ты зялёны
Ты чырвоны,
Ты ў кажусе,
У цябе сіні нос –
Гэта ты,
Марозка-Мароз!

Выбіраюць "Мароза" і разбягаюцца па пляцоўцы. "Мароз" бяжыць за імі і стараецца дакрануцца да каго-небудзь рукой. Той, да каго ён дакрануўся, лічыцца "замарожаным" і павінен спыніцца і развесці рукі ў бокі. Іншыя удзельнікі могуць "размарозіць" яго, пляснуўшы рукой па плячы.

Гульня праводзіцца пэўны час. Пасля кожных 3-5 хвілін выбіраецца новы "Мароз". Перамагае "Мароз", які здолее "замарозіць" большую колькасць удзельнікаў гульні.

Сусед і суседка



Моладзь, дзяўчаты і хлопцы садзяцца парамі на лавах. Распарадчык гульні пытаецца ў аднаго з хлопцаў:

- Сусед, ці любіш суседку?
- Не, не люблю.
- А каго любіш?
- Паўліну.

Паўліна і суседка павінны памяняцца месцамі, але ў гэты час і сам вядучы можа заняць месца Паўліны. Тады суседцы прыйдзецца весці далей гульню. Калі ж хлопец сімпатызуе суседцы, то адказвае "Люблю", і яна будзе сядзець з ім, пакуль хто іншы не выклікае яе.

Хустка

Дзяўчаты ўтвараюць вялікі круг, становяцца тварам да цэнтра. У цэнтры круга -- адзін з хлопцаў. Дзяўчаты за спінамі перадаюць адна адной хустку. Хлопец павінны здагадацца, у каго хустка. Калі ўгадаў, то выводзіць дзяўчыну ў круг. З яе бярэцца выкуп *(песня, танец, пацалунак)*.

Угадваць можна не болей трох разоў. Неўгадаўшы выбывае з гульні. Дзяўчына пасля выкупа застаецца ў цэнтры круга. Цяпер вакол яе ўтвараюць круг хлопцы, а яна павінна ўгадаць, у каго з хлопцаў хустачка. Гульня паўтараецца.

Жаніцьба Цярэшкі

Народная гульня, прымеркаваная да Каляд, папулярная на Беларусі. Выбраныя са старэйшых удзельнікаў "маці" і "бацька" злучаюць хлопцаў і дзяўчат у пары *("жэняць" іх)*. Гульня спалучаецца з рознымі танцамі *("Бычок", "Бярозка", полькі)*, вясёлай мітуснёй *(дзяўчаты ўцякаюць па чарзе ад хлопцаў уздоўж выстраеных у дзве лініі пар, а хлопцы даганяюць іх)*, прыпеўкамі на калядны напеў.

Яшчур

Карагод-гульня. Называўся таксама "Яшчар". Дзяўчаты



аддавалі “яшчуру” (хлопцу, які знаходзіўся ў цэнтры круга) свае вянкі або хусткі, пярсцёнкі і інш. Адбывалася гэта пад гукі песні:

Сядзі, сядзі, яшчур,
У гайку ў зялёным,
У арэхавым кусце,
На залатым крэсле...

Потым кожная дзяўчына прасіла:

Пане яшчур,
Аддай мой вяночак,
Мой вяночак залаты
Згубіла з галавы.
Будзе мяне мамка біць.
Ды некаму бараніць.

Каб выкупіць вянок, дзяўчына цалавала “яшчура” або выконвала якое-небудзь іншае яго пажаданне. У розных мясцовасцях існавалі некаторыя адрозненні ў гульні і песнях, але шлюбная тэматыка іх паўсюдна заставалася нязменнай. Карагод-гульня быў пашыраны па ўсёй Беларусі.

У фальклоры вянок сімвалізуе чысціню і цнатлівасць. Рускі савецкі гісторык Б.А.Рыбакоў бачыць у беларуским варыянце “Яшчура” трансфармацыю прынясення дзяўчат у ахвяру дракону-яшчару - гаспадару падземна-падводнага царства. Паводле яго тэорыі, ў старажытнасці лічылі, што сусвет складаецца з трох частак: падземна-падводнага свету, які прадстаўлены драконам-яшчурам, сярэдняга, населенага людзьмі і шаманамі, і верхняга, нябеснага, населенага жанчынамі-ласіхамі. Невыпадкова на Палессі адначасова з гульнёй “Яшчур” існавала падобная да яе гульня “Олей” *(алей, мусіць, алень).* У гульнях адбіліся сляды старажытных міфаў пра аленяў і ласёў. У неалітычных пасяленнях беларускія археолагі знаходзяць фігуры аленяў, выразаных з рога. Магчыма, што “Яшчур” спарадзіў многія гульні шлюбнай тэматыкі.



Шоу-забава

Развітанне з парсючком і сустрэча з пацучком

Па-святочнаму прыбраная зала. Зіхаціць рознакаляровымі ліхтарыкамі прыгажуня-ёлка. Гучаць, змяняючы адна другую, знаёмыя мелодыі.

Гасцей сустракаюць ля гардэроба з вясёлымі прыгаворкамі і пацешкамі. Дапамагаюць прайсці ў залу. Калі госці занялі свае месцы за столікамі, пачынаецца праграма.

Загучала прыгожая цыганская мелодыя. Вядучая ў вобразе цыганкі пад захалляючыя гукі прайшлася ў танцы. Падышла да мікрафона і прывіталася.

Цыганка:

Добры вечар! Святочны вечар!
Вам, людзі добрыя!
Госці званыя!
Калегі слаўныя!

Не глядзіце, што гэты вечар пачынае цыганка-варажбітка. Думаеце, што не традыцыйны вобраз? А чаму і не? Давайце на конт гэтага паразважаем разам.

І студзеня мы віншуем адзін аднаго такімі словамі: "З Новым годам! З новым шчасцем!" Самі таго не заўважаючы, "варожым". Мы варожым і тады, калі адкрываем са стрэлам бутэльку шампанскага, і калі ўпрыгожваем бліскучымі цацкамі ёлку, і калі накрываем святочны стол.

- Возьмем шампанскае, а чаму абавязкова толькі гэты напой мы павінны купіць да навагодняга свята? *(Чакае адказ... потым таго адорвае шчаслівым білетам).*

Так, калісьці чалавек страляў з ружжа, званіў у званы, каб адагнаць ад сваёй хаты злых духаў.

А ёлка, чаму менавіта яе, а не бярозу мы прыносім у хату? *(Адказ...)* Так яно і было. У 1500 годзе, у Германіі, зялёная ёлка была ўпершыню з Эльзаскага лесу прынесена ў палац.

Але ж самая галоўная магія была закладзена ў навагодняе



застолле.

Адкажыце, калі ласка, а чаму патрэбна, каб святочны стол ажно ламіўся ад разнастайных страў? *(Адказ з залы).* Каб быў у сям'і на працягу новага года дастатак. А ў нашых суседзяў з Германіі на навагоднім стале абавязкова павінна быць свініна з квашанай капустай. Па-нямецку "маю шчасце" гучыць у дакладным перакладзе "маю свінню", а квашаная капуста лічыцца лекавым сродкам. І хто гэтай стравай частуецца пры сустрэчы Новага года, будзе здаровы і шчаслівы ўвесь год. Вось я вас і настроіла да свята, пра ўсё магічнае ўспомніла. На шчасце і добрае здароўе загаварыла.

- А зараз, калі ласка, адкрыйце свае бутэлькі шампанскага.

А я кажу вам, з Новым годам! З новым шчасцем! *(Загучала мелодыя "Цыганачкі". Вядучая ў танцы прайшлася па зале і села за святочны стол).*

Змяняецца мелодыя на сучасную. Пад вясёлую музыку з'яўляецца тоўстая жанчына у доўгай спадніцы, у руках трымае паднос з усялякімі гасцінцамі. Падыходзіць да мікрафона.

Вядучая:

Добры зімовы дзянёчак, шаноўныя спадары і спадарынькі!

На жаль, апошні ў вашай хаце.

Дазвольце мне, парсюковай жонцы, на развітанне перагаварыць з вамі. Няхай гэта будзе мая справаздача, але з вашым удзелам.

А ці не ўспомніце, якое надвор'е было ўлетку*? (Адказ залы.)*

Залатая восень, што падарыла яна вам?

Ці былі ў вас восеньскія пацалункі?

Ведаю, што ў зале сабраліся вельмі ўдалыя і клапатлівыя гаспадары.

Вось вы, адкажыце колькі бульбы накапалі?

А вы, колькі слоікаў агуркоў накансервавалі?

Ой ведаю, што з кабачкоў і варэння наварылі, а кажуць што цукру не хапае. Углядаюся й бачу, што кожны з вас дбайны гаспадар. Такі сабралі ураджай, што ніякія мышы не з'ядуць. А



зараз, калі ёсць хлеб і да хлеба, давайце ўспомнім, якія значныя падзеі адбыліся за 1995 год у жыцці нашай Беларусі? *(Адказ з залы.)*

- Успомніце ўсіх знаёмых добрых людзей, з кім вас звёў лёс у гэтым годзе.

(За кожны адказ вядучая частуе сваімі прысмакамі з вясёлымі прыгаворамі.)

- Вось і надышоу час з вамі развітацца ажно на 12 год. Знайшла сабе фундатара, багатага парсючка, і паеду з ім адпачываць у Анталію. Будзем есці апельсіны, бо мы ў іх добра разбіраемся.

Падымае келіх з шампанскім.

- Адышоў час Парсюка,
Ён пакінуў свой прыплод.
Людцы! Будзе вам у лютым
Больш на дзень прыгод.
І хоць кажуць "высакосны",
Хай ён будзе шчасцяносны!
У добрых справах суадносны,
На прыбытак пладаносны!

За пражыты год! Шчасця вам і дабра, і да новай сустрэчы!

Загучала джазавая імправізацыя на тэму песні "Маленькай ёлачцы холадна зімой".

З'яўляецца вядучая ў вобразе Снягуркі.

Снягурка:

Ой, як тут светла і цёпла. Добры вечар вам!

Ну што такія здзіўленыя позіркі? А, зразумела, што прыйшла адна. Няма Дзеда Мароза? Думаеце, з-за інфляцыі? Грошай не хапіла каб яго запрасіць? Дзед Мароз, а чаму толькі ён павінен з'явіцца ў Новы год? *(Чакае адказ.)*

- Так яно і ёсць. У адзін час, калі з'явілася традыцыя прыносіць у хату ёлку, у Расіі нарадзіліся і мы: я і Дзед Мароз. А вось у Галандыі падобны дзед называецца Клаас, і прыходзіць ён з унучкам-неграм, Чорным Петэрам. *(Гэта даведка тым, хто у Новым годзе сабраўся наведаць Галандыю).*



Загучала мелодыя “У лесе нарадзілася ёлачка”, і ў залу прыходзіць Дзед Мароз.

Дзед Мароз:

Добры вечар! Багаты вечар!

Людзі маладыя, сталыя ды удалыя!

Снягурка:

Дзядуля, а дзе ж ты так забавіўся?

Ішлі разам, а потым куды ты завярнуў?

Дзед Мароз:

Дзе, дзе - нідзе.

Нікуды не зварочваў, крыху пастаяў, палюбаваўся вашым акенцам і ўспомніў словы нашага незабыўнага Максіма Танка:

Гавораць, каб радасным быў
Новы год,
Гасцінна яго
Трэба стрэць ля варот,
За стол
На чырвоным куту пасадзіць,
Шампанскага
Поўную чарку наліць.
І так я не раз сустракаў
Новы год! Ды толькі не меншала
Нашых турбот.
І сёння, пакуль за яго
Чарку ўзняць,
На што будзе шчодры,
Хацеў бы я знаць.
На хлебныя ці ўраджайныя дні,
На мірныя
Ці неспакойныя сны.
Снег кружыць, снег кружыць
Няхай на зямлі людзей ён падружыць!

Гэтую чарку давайце паднімем за сяброўства паміж вамі, суседзямі-Краінамі! Каб на зямлі панавала толькі каханне, паразуменне, дабро і згода!



- А ты што думаеш, мая ўнучачка? Паглядзіце, якая прыгажуня, зіхаціць, як сняжынка на сонейку! Ды і ў залу ўвайшла папярод дзеда... А ці вывучыла прывітальны вершык?

Снягурка:

Паважаныя гаспадары!
Шаноўныя госці!
Рада я сёння вас прывітаць,
З Новым годам павіншаваць!
Шчасця ўсім пажадаць!
Каб у вашых справах толькі перамогу знаць!
Каб заўсёды людзі вас шанавалі,
Каб аніякай бяды не зналі,
Каб жылі ў дастатку,
Каб было ўсё ў парадку,
Жыць вам – весяліцца,
Доўгімі гадамі ўсяго таго вам, што хочаце самі!

Дзядунь, а можа ўсіх запросім устаць у карагод, узяцца за рукі. Давайце крыху пагуляем каля ёлачкі, як на дзіцячым ранішніку.

Свята, свята Новы год!
Запрашаем у карагод,
Свята, свята, чарадзей,
Падары нам пяць надзей.

Дзядунь, ну і сур'ёзныя людзі сабраліся, не хочуць карагодзіцца.

Дзед Мароз:

Гуляй сабе гуляй, але галавы не губляй!
Ну што ты там наляпятала, якія пяць надзей?

Снягурка:

Вось табе і на, нас, маладых, зусім не разумеюць.

Вечар пачаўся з варажбы, цыганка варажыла. Усе ад малога да старога, сустракаючы навагоддзе, маюць на што-небудзь надзею. І я хачу таксама падарыць пяць сваіх варожб, а значыць пяць надзей. Калі ласка, пакладзіце свае відэльцы і ўважліва паслухайце. *(Гаворыць таямніча.)*



Надзея першая

Па пярсцёнку

На безыменны палец левай рукі надзелі пярсцёнак з брыльянтам, на плечы накінулі норкавае манто, селі побач з мужам у перламутравую "Вольву" і паехалі ў свой катэдж. Там напоўнілі падагрэтай вадою басейн з саунай. Цёпла? А чаму так нясмела? Ціха ўсміхаецеся? У вас усяго гэтага няма? Няма чаго і варажыць. Бо ваш муж сумленны чалавек, малодшы навуковы супрацоўнік, з заробкам 420 тысяч рублёў. І вы правільна зрабілі свой выбар, даверыўшы яму адзінаму свой лёс.

Надзея другая

На гушчы чорнай кавы

Пайшлі у кафэ "Архідэя". Заказалі кубачак чорнай кавы. Выпілі. Кубачак перавярнулі на сподачак і чакаеце. Калі на сподачку нічога не з'явіцца, то гэта не кава. А калі з'явіцца, гэта і ёсць натуральная бразільская кава, а вас прынялі за правяраючага з каманды прэзідэнта.

Надзея трэцяя

На картах

(Для метадыстаў і навукоуцаў)

Пакладзіце на стол карту Беларусі. Заплюшчыце моцна вочы, ткніце тры разы алоўкам. Расплюшчыце свае вочкі і паглядзіце, куды папалі. Заплануйце туды камандзіроўку. Там вас вельмі чакаюць. Там абавязкова вам пашанцуе, бо вы знойдзеце тое, на што вы ўсё жыццё спадзяваліся, за што вас уславяць.

Надзея чацвёртая

Па руцэ

Уважліва паглядзіце на левую далонь. Вы ўбачыце дзве доўгія лініі. Адна з іх - лінія жыцця, а другая – лінія метро. Калі яны



ідуць паралельна, значыцца выпадае вам жыццёвы шлях з усімі прыпынкамі. А калі яны перасякуцца, то там, куды вы так упарта кожную раніцу ездзіце, сустрэнеце свой лёс, ці адбудзецца службовы раман. Таму ціхенька паглядзіце на свайго суседа ці суседку... А можа, гэта ён ці яна?

Надзея пятая

Па тэлефону

Тэлефануйце па нумару 19-98 - перад гэтымі лічбамі пастаўце любыя дзве лічбы гарадской тэлефоннай станцыі (66, 27,..) і чакайце. Калі пачуеце мужчынскі голас, не адкладваючы пазнаёмцеся, а калі жаночы, зрабіце так, як робяць мышы... А калі вам ніхто не адкажа, тэлефон адключылі за неразлік у свой час, таму і вы хуценька кіньце сваю трубку, каб і на ваш родненькі тэлефончык меней грошай набягала.

Дзед Мароз:

Ну нагаварыла!

Чаму ў нас такая моладзь гаваркая? І дзе яны толькі панавучваліся?

Снягурка:

Ад вас, дзядулька!

Дзед Мароз:

Ну добра, добра, на вас, маладыя, усе нашыя надзеі:

На разумны парламент, на добрае і мірнае жыццё.

Каб усім усяго хапала, і сала, і да сала.

А нам развітацца часіна настала.

Пад мелодыю "У лесе нарадзілася елачка" Дзед Мароз і Снягурка пакідаюць святочную залу.

Загучала мелодыя "Шэрая мышка" ў запісе Алесі і гурта "Сябры". У залу ўлятае струмкая ханчына ў прыгожай доўгай спадніцы, на вачах маска *(лятучая мыш)*. У руцэ веер.

Вядучая ў вобразе Мышы:

Добры вечар!

Давайце пазнаёмімся.

Я - Мыш! Я прыгажуня Крыса!



Так гучыць па-расейскі, хутчэй, па-славянску.

У слоўніку пра мяне напісана: млекакормячая жывёліна сямейства мышападобных, пераважна з шэрай поўсцю і доўгім хвастом. У беларусаў - пацук, у рускіх - крыса, ну што - атрымалася Ён і Яна?

Будзем мець надзею, можа атрымаецца "Салодкая парачка".

Вось вам і тэма для навуковай працы. А я пачынаю з сюрпрызаў. *(Раскрывае свой веер, на якім напісана слова "Пацучок".)*

Я называю літарку, а вы павінны здагадацца, што за падарунак я вам прынесла. Зразумела ўсім? *(Называе літары.)*

П - прышчэпка, паштоўка, пернік, пяцёрка...

А - агародніна, арэх, аловак, аўтарытэт...

Ц - цукерка, цуд, цвік, цукар....

У - убор, узор, кроп,...

Ч - часопіс, чарцянё, часнок, чабрэц, чапяльнік...

О - ордэн, (навагодні, з вясёлымі пажаданнямі)...

К - кветка, каўбаса, келіх гарэлкі, казка, кавалер...

Усе падарункі дорацца з прыгаворамі, каб было весела.

- А можа, мы з вамі, як у той думе, усе разам прыдумаем дэвіз года?

Усе ж як-ніяк, а прыйдзецца пратанчыць 366 дзянёчкаў.

Вось мая прапанова: "Ухапі пацучка за шэрую поўсць і пройдзе злосць!" Аб'яўляецца конкурс на лепшы дэвіз года, за які аўтар атрымае галоўны прыз.

- Вы ведаеце, што годам парсюка закончыўся дванаццацігадовы каляндар. А я распачала з пачатку. Чаму мне пашана? Чаму я першая? А было гэта так.

Жывёлы разабралі 11 гадоў: каровы, тыгра, зайца, дракона, змяі, каня, авечкі, малпы, курыцы, сабакі і свінні. А першы год застаўся без назвы.

За яго мы з вярблюдам паспрачаліся. Хто першым на золку ўбачыць прамень сонца, той і пераможа. Надзьмутыя, селі мы кожны ў свой бок. Ён задраў галаву на ўсход, а я — на захад. Сядзім. Думаеце, што я маленькая, дык мяне можна



пакрыўдзіць? Але ж, як гавораць, "трэба розумам надтачыць, дзе сіла не возьме.." Моўчкі пільна гляджу, ажно першы прамень і асвяціў на маім захадзе высокую гару. Я як закрычу: "Сонца ўстала, вітаю цябе, сонейка!" Усе адзінаццаць жывёл былі сведкамі маёй знаходлівасці. Так я і стала пераможцам.

- А зараз, калі ласка, устаньце, усе мае астралагічныя браты і сёстры. Вам прысвячаецца танец.

Аб'яуляю аўкцыён. Мужчыны, я звяртаюся толькі да вас. Якімі рысамі характару адораны жанчыны, якія нарадзіліся ў год пацука? *(Адказ залы – прыгожыя, фігурныя, эканомныя і г.д.)* Жанчыны, а зараз вы назавіце рысы характару мужчын-пацукоў? *(Недаверлівыя, палітычныя, шукальнікі асабістай карысці)*. Вядучая выбірае пераможцаў сярод мужчын і жанчын. Ім прапануецца іспыт, "хто лепш лічыць грошы" *(Умовы гульні ў дадатку.)*

Крыса і пацук з усяго шукаюць асабістую карысць.

Дакладна ведаю, хто народзіцца ўлетку, будзе напрацягу ўсяго жыцця ўдалым, здаровым і шчаслівым. Таму мая парада маладым - не губляйце дарэмна часу, і прыслухайцеся. Можа зноў скажаце, грошай не хапае? Было б каханне, а яно і без даляраў салодкае.

Даляраў не злажылі
Ні ў панчохі,
І ні ў сундучок,
Цэлы год пражылі
З табою, парсючок.
Не будзем нудзіцца,
Спяваць, весяліцца.
І свята праславім,
І чарку паставім,
Сустрэнем з усмешкай,
Каб шэрым не стаў Пацучок!

Абяцаю перад усімі, што ўсе намаганні прыкладу, каб напрацягу года вам не было горш, як сёння! І сардэчна запрашаю гуляць, спяваць ды гумару свайго не губляць!



Навагодняя гульнятэка

Шчаслівыя білеты цыганкі

1. Будзь вясёлы, як сват на вяселлі, здаровы, як вада, багаты, як зямля!

2. Будзь здаровы на ўвесь год, як калядны лёд.

3. Каб вам ціха спалася, лёгка ўставалася, спрытна хадзілася.

4. На здароўе вам, на злосць ворагам, на безгалоўе вялікім панам і тым бесавым сынам, што завідуюць вам.

5. Вялікі расці, добра гадуйся, да новага свята лепей рыхтуйся.

6. Пацуковыя усмешкі, як арэшкі - лускай без лішняй спешкі.

Гульня з прыгаворам

Прымаўкі пішуць на карткі па аднаму слову. Раздаюць на кожны стол. Госці павінны яе злажыць. Хто першы прачытае сваю прымаўку, той і пераможца.

"Гуляй, хлапец, будзе і на цябе лавец!"

"Дзе чара, там і свара."

"Бурымэ"

Пераклад з французкай мовы (рыфмаваныя аканчаткі).

У гэтую гульню любіў гуляць А.С.Пушкін. Ён заўсёды выходзіў пераможцам сярод сваіх сяброў. Прапануйце сваім гасцям наступныя рыфмы:

.. вечар
.. адна
.. сустрэча
.. яна
.. каханне
.. спатканне
.. спакою
.. са мною



.. дамоў
.. госць
.. сяброў
.. маладосць
.. парсюка
.. пацука
.. за вуха
.. навука
.. любым
.. Новы год
.. шлюбам
.. мёд

Пераможца сярод гасцей вызначаецца “паэт года”.

Навагоднія варожбы

У наш час варажба ператварылася ў гульню.

Запрасілі ўсіх дзяўчат і жанчын стаць у кола. Пасярэдзіне кладуць люстэрка, кашалёк, часопіс, на талерцы – зерне, лустачку хлеба, бутэльку, ключы, аловак, грэцкі арэх, апалонік, партрэт вядомага артыста, даляр і г.д. Вядучая лічылкай выбірае, на каго будуць варажыць.

З-пад печкі каціцца
Галубое плацціца.
На баку зялёны бант,
Цябе любіць лейтэнант.
Зваць яго Валодзенька,
Хлопец ён малодзенькі.
Цераз годзік, цераз два
Будзеш ты яго жана.

Дзяўчыне, якую выбралі, завязваюць хусцінкай вочы, круцяць вакол сябе, і у гэты час мяняюць месцамі пакладзеныя рэчы. Калі дзяўчына астанавілася, ёй здымаюць хусцінку і глядзяць, што ёй выпала.



Люстэрка – прыгажун, зерне - старанны чалавек, арэх - спартсмен, апалонік- повар, часопіс-журналіст, ключы - кватэра, бутэлька – будзе з пашанай адносіцца да гарэлкі.

Мышыная валтузня (смешныя атракцыёны)

Шыбуршэнне газетай

Удзельнічае 5 чалавек.

Кожнаму ў левую руку пакладзіце газету, а правую схавайце за спіну. Па загаду вядучага, газету трэба "шыбуршыць" – схаваць у свой кулак, каб не было бачна.

Пераможа той, хто хучэй выканае ўмовы гульні.

Вазьмі цукерку

На талерку пакладзіце цукерку, прысыпце мукой. Па загаду вядучага ўдзельніку гульні трэба з'есці цукерку без дапамогі рук. (Талеркі з цукеркамі па колькасці ўдзельнікаў гульні)

Пераможца – "самы кемлівы."

Цудадзейны яблык

На вуду прычапіць яблык. Па загаду вядучага ўдзельнік гульні вуду трымае за спіной.

Пераможа той, хто першы з'есць свой яблык.

Хто лепш лічыць грошы

У талерку насыпаюць крупы і фасолю. *(Фасоля будзе замест грошай.)*

Гуляюць удвох, мужчына і жанчына.

Правай рукой яны трымаюць адзін аднаго, а левай яны павінны ў крупах знайсці свае "грошы". Пераможца той, хто больш знойдзе фасолін.

Са свісцёлкамі

Выбіраюцца 3-4 пары. Вядучы кожнаму дае па свісцёлцы і гаворыць:



- Мы ведаем, што ў мышыным каралеўстве ўсе пішчаць. Давайце і мы з вамі неяк паспрабуем быць перакладчыкамі пацуковай мовы. Я буду даваць загады, а вы павінны выконваць іх, але ж размаўляць паміж сабою забараняецца. Патрэбна свае адносіны выказваць праз свісцёлкі. Зразумелі? Крыса і пацук пазнаёміліся паміж сабою, выказалі любасць адзін да аднаго. За гэтай сустрэчай пільна сочыць пацуковая жонка. Новая сяброўка пацука зразумела, што ён жанаты. Яна выказала сваё абурэнне за ашуканства. Пацук спрабуе растлумачыць складанае становішча. Прымірэнне.

У канцы спаборніцтва госці апладысментамі выбіраюць пару-пераможцу.

З НОВЫМ ГОДАМ!

Калядныя вячоркі

Удзельнікі Каляд збіраюцца ў клубе ці ў якой-небудзь вялікай хаце. Іх некалькі гуртоў *(тры ці чатыры)*. Яны дамаўляюцца, які гурт пойдзе па якой вуліцы і з якога канца пачынаць паход у Каляды. На двары стаяць ужо запрэжаныя коні ў санях. Яны ўпрыгожаны стужкамі, званочкамі. Кожны гурт садзіцца на свае сані і, дамовіўшыся, з песнямі, прыпеўкамі, музыкай і жартамі імчыць да плошчы, дзе стаіць ужо ўпрыгожаная ёлка і збіраюцца гледачы і ўдзельнікі Калядак.

На першых санях едзе Дзед-пачынальнік (ён – сімвал даўгавечнасці жыцця, здароўя, весялосці).

Дзед і пачынае свята, ён віншуе аднавяскоўцаў з надыходам Каляд, з Новым годам, дае кароткі расказ пра паходжанне гэтага свята. Расказвае праграму свята, што за чым будзе адбывацца, запрашае ўсіх улівацца ў гурты калядоўшчыкаў. Затым гурты калядоўшчыкаў выконваюць прывітальную песню і запрашаюць усіх у Каляды. Яны з жартамі садзяцца на сані і едуць па сваіх вуліцах. Пачынаецца Калядаванне.

Перад ад'ездам ад плошчы персанажы даюць напрамак



Калядавання і прыкладныя віншаванні.

Дзед:

Ой ты, пан харошы,
Рыхтуй пятак і грошы.

Цыган:

Мерачку аўса,
Наверх – каўбаса.

Механоша:

Кусок сала,
І таго мала

Усе:

Гэй, Каляда!

Калядоўшчык:

Прыехала Каляда ў вазочку,
Прывезла дудак рэшата.

Дзед:

Ой вы, хлопчыкі, не зявайце,
Сабе дзевак выбірайце!

Цыган:

У згодзе жыць –
Калядзе дагадзіць!

Усе:

Гэй, Каляда!

Павадыр:

Што край, то звычай,
Што старана, то навіна.

Механоша:

Каляду сустракаць –
Гасцінцы рыхтаваць.

Усе:

Гэй, Каляда!

Лявоніха:

З Калядой здружыцца –
Печь і весяліцца.

Цыган:

Хто Каляду мінуе,
Таму бог не даруе.

Павадыр:



Казу вядзём,
Усім радасць нясём.

Па дарозе спяваюць:
Пайшла Каляда, Калядуючы.
Эй, Каляда, Каляда!
А за ёю дзеўкі, шчадруючы.
Эй, Каляда, Каляда!
Пайшла Каляда ў адну хату.
Эй, Каляда, Каляда!
А ў гэтай хаце сала шыпіць.
Эй, Каляда, Каляда!
Пайшла Каляда ў другую хату.
Эй, Каляда, Каляда!
А ў гэтай хаце срэбра звініць.
Эй, Каляда, Каляда!
Пайшла Каляда у трэцюю хату.
Эй, Каляда, Каляда!
А ў трэцяй хаце золата блішчыць.
Эй, Каляда, Каляда!
Пайшла Каляда ў чацвертую хату.
Эй, Каляда, Каляда!
А ў чацвертай хаце каўбасу пякуць,
Каўбасу пякуць, ды й нам даюць.
Эй, Каляда, Каляда!
Падыходзіць да першай хаты,
З якой дамовіліся,
Запальваюць звязду пад акном.

Адзін вядучы заходзіць у хату, каб спытаць гаспадароў, ці можна Каляду спяваць. Атрымаўшы дазвол, выходзіць і абвяшчае гэта ўсім.

Першы вядучы пад акном.

1-ы вядучы:

Шчодры вечар, добры вечар,
Пане дзядзьку гаспадар!
Мы твой дом віншуем
З Новым годам, з Калядкамі, са святам.



2 вядучы:

Жадаем вам шчаслівага спаткання
Дый за год зноў Каляду даждаці!
Дазволь, пане гаспадар, Каляду заспяваці!

Па дазволу гаспадара ўсе ўдзельнікі спяваюць песню. Пасля таго, як выканана песня, слова бярэ дзед:

Гаспадарушка наш бацюшка
Падараў гасцей-калядоўшчыкаў
З клеці рэшатам, з печкі пірагамі,
Падай каўбасу, я ў зубах панясу.
Хоць адзін маю, але ўтрымаю.
Гаспадар частуе калядоўшчыкаў.

Дзед:

Дзякуй, гаспадарок, за пачастунак, нам яго хопіць на цэлы год, але вось у мяне ёсць тут жывёліна, прыйшлі мы да вас з казою шэраю, вясёлаю. Дык няхай жа яна паскача для вас.

Каляднікі спяваюць, а "каза" выконвае рухі паводле зместу песень.

Каза мая вучона,
Прайшла ўсе навукі,
Знае розныя штукі.
Ну-тка, козенька,
Расхадзіся, развесяліся
І ўсяму дому пакланіся.
І гаспадару, і гаспадыньцы,
Яшчэ краснай Марыйцы.
(Каза кланяецца)
Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэрая,
То на рожанькі,
То на ножанькі
Пакланіся зграбна,
Пакланіся складна!

(Каза верціцца. Каляднікі ўцягваюць у танец гасцей. У канцы каза падае.)

Дзед:



Гаспадар ідзе, каўбасу нясе,
Тры кускі сала, каб каза ўстала,
І мерку жыта, каб каза была сыта!
Уставай, паклонімся гаспадару і гаспадыньцы.

Гаспадары частуюць казу, яна ўстае і калядоўшчыкі з песнямі і жартамі ідуць да другога дома, дзе таксама спяваюць песні, просяцца увайсці ў хату, виншуюць гаспадароў.

Прыкладная тэматыка выступлення калядоўшчыкаў у другой хаце.

Дзед:

Добры дзень таму, хто ў гэтым даму!
Гаспадарочак, ясны паночак
Аляксандр
Ці спіш, ці ляжыш, ці адпачываеш,
Ці Каляду сустракаеш?
А калі не спіш, гукай са мной,
А калі ты спіш, дык бог з табой.
Мы госцікі не дакучыя
Не часта ходзім, не дакучаем,
А ў гадочак адзін разочак.

Цыган:

Твая хата, ёсць і мядок, і сырок, і каўбаса, піражок – носам чую, дазволь завітаць, калядную песню заспяваць.

Каляднікі, як зойдуць у хату:
Гаспадынечка, перапёлачка,
У цябе сырнічкаў поўная полачка,
А ты тут нас частаваць будзеш,
А мы цябе віншаваць будзем
І з дзеткамі, і з сямейкаю,
І яшчэ з добрым здароўечкам,
Каб да лета дачакала,
Каляднічкаў зноў сустракала,
Падарачкамі надзяляла.

Выконваюць песню. Гаспадыня раздае пачастункі.

Каляднік 2-і:

Вось за гэты піражок зарадзіла каб жыта стажок.



1-ы:

Каб у гэтай хаце
Было заўсёды што даці,
Каб мякіну не таўклі
І хлеб з яе не пяклі!

2-і:

Каб заўсёды была хата прыбрана,
Міскі, лыжкі памыты,
А вашы дзеткі сыты!

У гэты час наперад прабіраецца "чорт", ён увесь час падслухоўвае і прыгаворвае.

Чорт:

Каб нічога не было, каб і жыта не расло,
Каб людзей не частавалі, каб і гумны пуставалі.

(Яго ўсе б'юць і гоняць ад сябе, але ён усё роўна ўсім замінае, перашкаджае.)

Калядоўшчык 3-і:

Каб шасткі ламіліся ад каўбас,
А бліны-аладкі самі выскоквалі з патэльні.

Чорт:

Каб бліны не адставалі
Каб патэльні прыгаралі.

(Чорта ўсе гоняць.)

Калядоўшчык 1-ы:

Каб былі поўныя коблы ежы,
А ў вашых хлявах шмат свіней і авечак!

Чорт:

Каб вашы куры не нясліся ды квахталі,
А свінні не вяліся ды здыхалі!

(На гэты раз чорту завязваюць рот, каб ён змоўк.)

Калядоўшчык 2-і:

Каб мірна, весела жылося,
Пілося і елася і яшчэ хацелася.

***Чорт* (вырываецца):**

Каб толькі па барадзе цякло,
А ў рот не падала!

(Чорта выганяюць за дзверы.)



Дзед: А цяпер, гаспадарочкі дарагія, дазвольце крышку патанцаваць, старыя косці размяць і першую ў танец запрасіць гаспадыню гэтай хаты.

Усе танцуюць: "каза", "чорт", "мядзведзь". Пасля танцаў калядоўнікі развітваюцца. Ідуць да трэцяй хаты.

Прыкладная тэматыка каляднага выступлення ў трэцяй хаце для трэцяга гурта.

Вядучы пад акном:

Шчодры вечар, добры вечар,
Пане дзядзьку гаспадар!
Мы твой дом віншуем
З Новым годам, з Калядкамі,
Са святам.
Дазвольце ў хату зайсці, Каляду заспяваць.

Калядоўшчык 1-ы:

Першая песня і гукі,
Каб у гэтай хаце не было скукі,
Каб жылі весела, шчасліва і багата
У сваёй роднай хаце!
Калі ласка, спевакі-падхватнікі, заспявайце для гаспадароў!
Каб вашы сталы былі багаты пірагамі,
А вашы кішэні грашамі.

Дзед пасля песні:

Дай табе, гаспадару,
І ў каморы, і ў амбары,
І на стайні вараныя коні,
Авечкі брухатыя ды валы рагатыя!
Дай табе, гаспадару,
Курэй падпечак і аўса засечак!
А парадуем зараз мы цябе мядзведзем вясёлым.

Важаты:

Ну-ка, Мішанька,
Паскачы харашэнька,
Не слухай-ка свяшчэнніка,
Панамара-бяздзельніка,
А слухай нашага брата-мядзведніка,



Хто цябе корміць, поіць,
Ад ліхіх сабак абараняе,
Шлях-дарогу паказвае.

1-ы:

А ну, Міхал, пакажы чэснай публіцы, як мужык Янка п'яны з кірмашу дамоў вяртаецца!

2-і:

А варвуля, Максімуля, патанцуй, пакажы, як бабы хлеб месяць!

3-і:

А пакажы, як дзеўкі перад люстэркам упрыгожваюцца!

4-ы:

А як хлопцы перад дзяўчатамі красуюцца, з імі заігрываюць?

Мядзведзь усё паказвае рухами.

А цяпер, Міхаіл, пакланіся гаспадару ды гаспадыні. Хай дасць пару кілбас і ковал саланіны, і ў руку 5 рублёў.

Гаспадыня частуе павадыра і мядзведзя. Калядоўшчыкі з песнямі ідуць да другой хаты.

Пасля таго, як Калядаванне па вуліцах закончылася, каляднікі на санях зноўку з'язджаюцца да клуба. Па мясцовым радыёвузле ў клубе ўжо абвешчана, што адбудуцца калядныя вячоркі. Прыкладны сцэнарый правядзення прыкладаецца.

Хто ён, суджаны?

(Калядная варажба)

Дзяўчына, якая хацела выйсці замуж, выбраўшы месца ля плота, бралася за кол і гаварыла: "Гэта кол – гэта калішча, гэта маладзік – гэта ўдавішча". Так яна перабірала кожны кол да апошняга. Калі ў гэтым месцы былі сказаны словы "гэта маладзік", то дзяўчына выйдзе замуж за халастога, калі "гэта ўдавішча" - за ўдаўца.

***



Дзяўчаты збіраліся ля кадодзежа, апускалі вядро ў студню і, дастаючы яго, па чарзе хапаліся рукамі за жэрдку з вочапам. Якая з дзяўчат ухопіцца апошняя, той першай давядзецца і замуж ісці (Капыльскі раён).

***

Насыпаюць кучку куцці, даюць есці пеўню і лічаць зярняты, што засталіся, пры гэтым прыкмячаюць: калі акажацца цотка - выйдзе замуж, лішка - не.

***

Дзяўчына кладзе сабе на ноч пад галаву грабянец, і хто будзе ў сне ім часацца, той будзе і суджаны яе (Піншчына).

***

Замужняя жанчына хавае пад накрыўку наступныя рэчы: хлеб, парсцёнак, шчотку, шыла, іголку і інш. І запрашае дзяўчат-удзельніц варажбы па чарзе падыходзіць і браць адну якую-небудзь рэч. Тая, што дастане хлеб, будзе мець багатага жаніха, пярсцёнак - прыгожага, шчотку - злоснага, шыла - шаўца, іголку - краўца (Віцебшчына).

***

У талерку налівалі вады, а на беражкі клалі пацеркі з напісанымі на іх імёнамі хлопцаў. Тады клалі на ваду верхнюю скарыначку хлеба, кавалак свечкі на яе. Затым трэба было тройчы пакруціць мезенцам па вадзе вакол скарынкі. Да якога імені скарыначка прыстане, тое імя будзе і ў жаніха.

Калядаваць - песні спяваць

Ці дома, дома сам пан гаспадар?
Ой, хоць і дома, той не гуляе,
Ды ў новым гумне пшаніцу вее.
Ой, хадзем, браткі, да й падвяселім,
Ці не дасць нам ды й па гарчыку?
Ці дома, дома ды й яго сынок?
Ой, хоць і дома, то й не гуляе,
Ды ў новай стайні коні сядлае.



Ой, хадзем, браткі, ды й падвяселім,
Ці не дасць нам ды й па коніку?
Ці дома, дома ды яго жана?
Ой, хоць і дома, то й не гуляе,
Ды ў новай хаце пірагі пячэ.
Ой, хадзем, браткі, ды й падвяселім,
Ці не дасць нам ды й па піражку?
Ці дома, дома, ды й яго дачка?
Ой, хоць і дома, то й не гуляе.
У новай каморцы хусты качае.
Ой, хадзем, браткі, да й падвяселім,
Ці не дасць нам ды й па хустачцы?

Шчодры вечар
(Беларуская народная песня)

1. На нова лета
Хай родзіць жыта!
Прыпеў: Шчодры вечар,
Багаты вечар!
2. Жыта, пшаніца,
Усякая пашніца.
Прыпеў: Шчодры вечар,
Багаты вечар!
3. Дай табе, божа,
Пану, гаспадару,
Прыпеў: Шчодры вечар,
Багаты вечар!
4. Гарэліцу гнаці,
Дачок аддаваці.
Прыпеў: Шчодры вечар,
Багаты вечар!
5. Піва варыці,
Сыноў жаніці.
Прыпеў: Шчодры вечар,
Багаты вечар!
6. На нова лета



Хай родзіць жыта.
Прыпеў: Шчодры вечар,
Багаты вечар!

Я.Колас
“НОВАЯ ЗЯМЛЯ”
Фрагменты з паэмы

Куцця. Марозна. Хмурнавата.
Сняжок падкідвае заўзята;
Снег на куццю - грыбы на лета.
Такая матчына прыкмета,
А сцежкі чорны - ягад многа;
Ну, і за гэта хвала Богу.
Абегаў Уладзя ручавіну,
І клін, і пасечку, лагчыну.
Па жменьцы ў снег аўса стаўляе -
Зайцоў ён гэтым прывабляе,
Каб праз акенечка з каморы,
Калі прынадзіцца каторы,
У ночку цёмную хадзіць,
Навесці стрэльбу і забіць,
Бо тут зайцоў было даволі.
І дроў на свята накалолі,
Трасянкі загадзя натрэслі,
Сянца пахучага прынеслі:
Куцці гаршчок ужо ў калена
Стаяў на лаве, чакаў сена...
У хаце добры лад і згода,
Як патрабуе і прыгода,
Паважнасць вечара святога –
Не ўчуеш слова ты былога.
Ды ўсе прыбраліс і памыліс,
Міхась з Антосем падгаліліс
І парасчэсвалі чупрыны.
“Ну, засцілайце стол, мужчыны!” –
І стол той гуртам прыбіраюць,



Настольнік белы падымаюць,
На стол растрэсваюць мурог —
На сене колісь быў сын-бог —
І роўным пластам рассцілаюць,
Сянцо абрусам закрываюць.
За стол садзяцца ўсе ў парадку.
І прад сабой кладуць аладку,
Відэльцы, лыжкі разбіраюць
І стравы першае чакаюць.
— Ты, брат, глядзі не ашукайся:
Не надта зразу накідайся,
Бо потым шчыра пашкадуеш,
Калі жывот свой напіцуеш:
Чым дальш - смачнейшыя патравы,
І многа іх, і ўсе цікавы;
Я знаю хітрасць гэту ўсю, -
Алесь гаворыць Кастусю.
І вось вячэра зачалася!
Спыніцца мушу я на квасе;
Ён колер меў чырванаваты;
Тут быў таран, мянёк пузаты,
Шчупак, лінок, акунь, карась,
Кялбок і ялец, плотка, язь,
Яшчэ засушаныя з лета.
Але не усё яшчэ і гэта:
Аздоблены квас быў грыбамі,
Выключна ўсё баравічкамі;
Цыбуля, перчык, ліст бабковы —
Ну, не ўясісь, каб я здаровы!
Пільнуй - цішком скажу між намі —
Каб і язык не ўцёк часамі.
За квасам елі верашчаку,
А потым блінчыкі на маку,
А там ламанцы-праснакі
З пшанічнай добрае мукі;



А макаў сок такі салодкі!
Ламанцаў у ім, ну як калодкі -
Так добра макам прыняліся,
У рот паложыш - абліжыся.
За прасначкамі йшлі кампоты,
Кісель з мядоваю сытою;
Вячэру скончылі куццёю,
На першы дзень святых Калядак –
Такі ужо быў стары парадак –
Збіралі сена са стала,
Кармілі ім каня, вала
І ўсіх жывёлін, хоць на жмені,
А на стале, у драбнюткім сене –
Здавён-даўна вялося й гэта –
Уважна зернетак шукалі
І па тых зернетках гадалі,
Які зародзіць хлеб на лета.

ПРЫМАЎКІ

Па Калядах уначы трашчыць, а ўдзень плюшчыць.

Ад Каляд не ідзе ў лад.

Як прыйдуць Каляды — мужыкі мякіне рады, а як прыйдуць зажынкі — няма хлеба ні асьмінкі.

Прыйшлі Калядкі — бліны ды аладкі.

Калядкі — добрыя святкі: пад'еў — ды на палаткі.

Пакінь сваё "дам" к Калядам.

Прападай ты, пане, з Калядою, аддай мой мех.

Ад Каляд тры разы пяць — пастушкі ў поле ляцяць.

На новы рок прыбудзе дня на зайчын скок.



Вясною





Гульні, прыказкі, загадкі

(са скарбніцы нашых продкаў)



У духоўнай спадчыне нашага народа ёсць такія скарбы, якім суджана жыць стагоддзі і здзіўляць сваёй мудрасцю і дасканалай формай многія пакаленні. Сярод іх — шматлікія жанры беларускай вуснапаэтычнай творчасці. Значнае месца тут займаюць прыказкі і прымаўкі, загадкі, скарагаворкі і гульні. Мы рэкамендавалі і ў ранейшых выпусках гэтыя залатыя россыпы народнай мудрасці ў надзеі, што культработнікі будуць карыстацца імі, пішучы сцэнарныя матэрыялы для сваіх мерапрыемстваў.

Прыказкі і прымаўкі

Благая тая птушка, што свайго гнязда не пільнуецца.

Калі ў школе з матчынай гаворкі пасмяецца, то на старасці ад маткі адрачэцца.

У лесе людзі дзічэюць, а ў людзях — люднеюць.



Засталася адна ў хаце — не дам рады кацяняці.

Благі абразіць, а добры разважыць ды яшчэ і парадзіць.

Добраму чалавечку добра і ў запечку, а ліхаце — кепска і на куце (а благаце блага і на куце).

Добрая слава людзей збірае, а дрэнная — разганяе.

Адзін і пры месяцы робіць, а другі і пры сонцы спіць.

Бяроза распускаецца — сей авёс, сады цвітуць — бульбу, каліна цвіце — грэчку.

Вішня не апала — зіма не настала, вішня апала — зіма настала.

Дзе шчырая праца — там густа, а дзе лянота — там пуста.

Жураўлі ляцяць высока — зіма яшчэ далёка. Калі год сухі — купляй пчолку, а калі мокры — купляй каноўку.

Не пытайся, ці галоўка гладка, а пытайся, ці падмецена хатка.

ЗАГАДКІ

І нажом зразалі,
І дратамі вязалі,
А ён не плача,
А па падлозе скача. (Венік.)

Фіту-міту, поўна шафа аксаміту. (Сажа ў коміне.)

На кургане, на вургане
Стаіць курачка з сяргамі. (Авёс.)

Узойдзе Ягор на бугор — вышэй лесу, вышэй гор,
З бугра спускаецца — з вачэй хаваецца. (Сонца.)

Нахмурыцца, насупіцца, у слёзы ўдарыцца — нічога не застанецца. (Навальніца.)

У гародзе летам цвіце жоўтым цветам, вышэй усіх



узняцца рад, бо ён сонцу малодшы брат. (Сланечнік.)

Сядзіць бабуся, сядзіць хатуся, а хто забачыць, дык заплачыць. (Цыбуля.)

Крутаста, вяртаста, на ёй сукань за ста, хто адгадае, той пажыве лет за ста. (Качан капусты.)

Хоць і красна, ды не дзеўка, хоць з хвастом, ды не мыш. (Бурак.)

Каля хаты ў садочку
Між зялёненькіх лісточкаў
Паглядзі: навідавоку
Шмат красунь чырванашчокіх.
Хоць прывабна пазіраюць,
Сэрцы каменныя маюць. (Вішні.)

На градзе агонь ірдзее,
Не пячэцца і не грэе.
Ён пахучы і прыгожы,
Нават дождж заліць не можа.
І з такіх агнёў-праменняў
Вараць смачнае варэнне. (Клубніка.)

Каціліся біруліцы па вуліцы, ускаціліся на двор, надуліся як мех, белы сталі, як снег. (Гусі.)

Прасіў цар царыцу да сябе на вячоркі, а яна кажа: "На неба не гляджу, па зямлі не хаджу, ды цябе не найду". (Рак і рыба.)

Што жанчына зробіць з гаршком, перш чым пачне ў ім варыць абед? (Паглядзіць у яго.)

Жыве без цела, гаворыць без языка, ніхто яго не бачыць, а кожны чуе? (Сумленне.)



Золата

Дзеці і нават дарослыя хлопцы і дзяўчаты часта гуляюць у гэтую гульню, сабраўшыся дзе-небудзь у хаце, а ў цёплае надвор'е — на двары ў каго-небудзь.

Адзін з удзельнікаў гульні бярэ пярсцёнак (так званае золата) і стараецца непрыкметна пакласці яго каму-небудзь у рукі. Пры гэтым гаворыць: "З кута іду, золата нясу, адгадайце, баяры, дзе золата ўпала. На куце ў паліцы, у красным, у ясным, у няшчасным". Хто-небудзь з удзельнікаў гульні адгадвае, каму пакладзена "золата". Калі не адгадае, усе над ім пачынаюць смяяцца, і ён будзе адгадваць да таго часу, пакуль не адгадае. Пасля кожнай няўдачы ў адгадванні пярсцёнак перахоўваецца.

А МЫ ПРОСА СЕЯЛІ

ЗАДАЧА

Удасканаліць навыкі перамяшчэння шарэнгай, выхаваць пачуццё калектывізму, сяброўскія адносіны дзяцей паміж сабой.

АПІСАННЕ ГУЛЬНІ

Дзеці, узяўшыся за рукі, стаяць дзвюма шарэнгамі, тварам адзін да аднаго. У адной шарэнзе стаяць хлопчыкі, у другой — дзяўчынкі. Хлопчыкі шарэнгай падыходзяць да дзяўчынак і спяваюць:

-А мы проса сеялі, сеялі! *(Ідуць на сваё месца.)*

Дзяўчынкі паўтараюць гэткія ж рухі і таксама спяваюць:

-А мы проса вытапчам, вытапчам, вытпчам!

-Ды чым жа вам вытаптаць, вытаптаць, вытаптаць? *(Ідуць і спяваюць хлопчыкі.)*

-А мы коней выпусцім, выпусцім, выпусцім! *(Ідуць*



дзяўчынкі.)

-А мы коней пераймём, пераймём, пераймём! *(Ідуць хлопчыкі.)*

-Ды чым жа вам пераняць, пераняць, пераняць? *(Ідуць дзяўчынкі.)*

-А шаўковым повадам, повадам, повадам! *(Ідуць хлопчыкі.)*

-А мы коней выкупім, выкупім, выкупім! *(Ідуць дзяўчынкі.)*

-Ды чым жа вам выкупіць, выкупіць, выкупіць? *(Ідуць хлопчыкі.)*

-А мы дадзім сто рублёў, сто рублёў, сто рублёў. *(Ідуць дзяўчынкі.)*

-Не трэба нам тысячы, тысячы, тысячы. *(Ідуць хлопчыкі.)*

-А мы дадзім дзеўчыну, дзеўчыну, дзеўчыну. *(Усе вяртаюцца назад. Адна дзяўчынка застаецца.)*

-Вось гэта трэба нам, трэба нам, трэба нам! *(Хлопчыкі падыходзяць да дзяўчынкі і становяцца кругам вакол яе. Дзяўчынка танцуе, а хлопчыкі пляскаюць у далоні.)*

ПРАВІЛЫ ГУЛЬНІ

Дзеці павінны рухацца роўнай шарэнгай: у той час, калі спяваюць хлопчыкі, дзяўчынкі стаяць на месцы і наадварот.

У ГАРЭЛЫША

Ігракі становяцца пара за парай, а спераду, спіной да пар, становіцца "гарэлыш". Ён павінны стаць прама і ні ў якім разе не глядзець па баках. Калі ўсе стануць, гарэлыш гаворыць:

-Гару!



Яму адказваюць:

- Гары, гары ясна, каб не згасла. Пых!

Тады задняя пара, раздзяліўшыся, аббягае ўдзельнікаў гульні і стараецца з'яднацца. Гарэлыш павінен пачуць, што яны бягуць, і злавіць аднаго з пары. Калі зловіць, то становіцца парай наперадзе ўсіх, а "гарэлышам" робіцца той, хто застаўся без пары. Тады гэтак жа бяжыць наступная пара і г.д. Часам прэдняя пара стараецца заглушышь шум бягучай пары ці, наадварот, крычыць:

- Бягуць! Бягуць!

Гарэлыш зрываецца з месца, калі задняя пара яшчэ стаіць, што выклікае агульны рогат.

ГРУШКА

АСНОЎНЫЯ ЗАДАЧЫ

Практыкаваць хадзьбу па кругу, узгодненасць рухаў, выхоўваць пачуццё дружбы, развіваць навыкі првільнага маўлення.

АПІСАННЕ ГУЛЬНІ

Дзеці ўтвараюць круг, у сярэдзіне якога знаходзіцца дзяўчынка ці хлопчык. Гэта і ёсць "грушка". Выбраць яе можна пры дапамозе лічылкі:

- Заяц-месяц, дзе быў?
- У лесе.
- Што рабіў?
- Лыкі драў.
- Куды клаў?
- Пад калоду.
- Выйдзі вон з карагоду!

Дзеці ідуць карагодам вакол "грушкі", спяваюць ці



гавораць хорам:

Мы пасадзілі грушку
Усе-усе!
Няхай нашая грушка
Расце,расце!
Вырасці ты, грушка,
Вось такой вышыні.
Распусціся грушка
Вось такой шырыні.
Расці, расці грушка,
Ды ў добры час,
Паскачы, Марылька (называецца імя дзяўчынкі ці хлопчыка),
Паскачы для нас.
А мы тую грушку
Усе шчыпаць будзем,
Ад нашай Марылькі
Уцякаць будзем!

"Грушка" імітуе ўсё тое, аб чым спяваюць (прамаўляюць) дзеці. Пасля слоў "А мы тую грушку усе шчыпаць будзем" малыя падыходзяць да "грушкі", каб дакрануцца да яе, потым хутка разбягаюцца, а "грушка" пачынае іх лавіць. Той, каго яна зловіць, стане "грушкай". Гульню паўтараюць 2-3 разы. Тая "грушка", якая выконвала лепш за ўсіх разнастайныя рухі, займае першае месца і атрымлівапе прыз.

Гульню можна праводзіць і ў пакоі, і на вуліцы.

ПЯЧЭННЕ ХЛЕБА



Спачатку двое бяруцца за рукі і кружацца, спяваюць:

Паскакаў верабей
Ды на сметнічку,
А сабраў верабей
Усю сямеечку.
Мала нас, мала нас
Для пячэння хлеба,
А ўжо нам, а ўжо нам
Аўдоська патрэбна.

Аўдоська становіцца ў круг.
Паскакаў верабей
Ды на сметнічку,
А сабраў верабей
Усю сямеечку.
Мала нас, мала нас
Для пячэння хлеба,
А ўжо нам, а ўжо нам
Сымонка патрэбны.

ПАДВОРАК НА МАСЛЕНІЦУ

МАСЛЕНІЧНЫЯ гульні і забавы ў многіх раёнах Беларусі накладваліся на гукальныя, карагодныя, маладзецкія, дзе хлопцы маглі паказаць перад дзяўчатамі сваю сілу, спрыт і кемнасць. Каталіся на санках, ездзілі на конях, гушкаліся на арэлях.

Дзяўчаты завязвалі хусткі з доўгімі махрамі, каб вырас доўгі лён. А хлопцам вешалі калодкі за тое, што яны нежанатыя. Спявалі ў карагодах прыпеўкі:

Гэй, вы, хлопцы, кругом



Вы ня спіце моцным сном,
А хадзіце раз у год
Паскакаць у карагод.
Ой, музыка, рэж за двох,
Не шкадуй ты маіх ног,
Мае ногі не баляць,
Яны хочуць танцаваць...

Ты мой дзед, ты мой дзед,
А я твая бабка,
Пачастуй мяне аладкай,
Каб была я гладкай!
Ой, ты, бабка мая,
Ты нядужанькая,
Напаю цябе гарбатай,
Будзеш дужанькая!
Музыканцік малады,
Ў цябе чубчык залаты.
Ў цябе чубчык кучаю,
Я ж цябе замучаю...

І сёння гучаць гэтыя словы прыпевак у карагодах-гульнях на Брэстчыне, Магілёўшчыне, у Мінскай вобласці.

Гульневыя падворкі на Капыльшчыне, Лепельшчыне прыгожыя. Тут ёсць "Блінная", дзе можна пачаставацца смачнымі аладкамі і гарачай гарбатай. Усюды запрашэнні: "У нашага бліна дармовая цана! Гарбата чабарова — будзеш здарова!". Праводзяцца аўкцыёны: "Хто болей назаве, з чым можна з'есці бліны?" Напрыклад: з мёдам, маслам, і хто апошні пасля ліку "3" скажа сваю назву, атрымае прыз на шыю — нізку абаранкаў. Гульні ладзяць розныя, каб было



весела і малому, і старому.

НЕ ЎСЁ КАТКУ МАСЛЕНІЦА
(дзецям)

Колькасць гуляючых ад 10 да 20 чалавек. Гуляючым адзначаюць лінію — "вуліцу", а на адлегласці 6—8 метраў ад яе круг "дом". Па дамоўленасці выбіраюць "кошку". Кошка становіцца ў "дом", і паміж ёю і "кацяняткамі", якія падышлі да яе на два крокі, адбываецца дыялог, у якім "кошка" задае пытанні, а "кацяняткі" павінны адказваць на іх. Напрыклад:

— *Кацяняткі-дзіцяняткі, дзе вы былі?*
— *На свяце масленіца!*
— *А што вы там рабілі?*
— *Аладкамі, смятанкай частаваліся.*
— *А дзе тыя аладкі са смятанай?*
— *Сабачка Цімка адабраў.*
— *А дзе той Цімка?*
— *Збег.*
— *Куды?*
— *Туды, дзе блінцы за так даюць...*
(Пытанні выдумляюцца гуляючымі).

Адказваючы, "кацяняты" могуць запнуцца, "кошка" крычыць: "Эх, вы, блінцоў пераелі!" — і ловіць іх. "Кацяняты" ўцякаюць на "вуліцу" *(становяцца на лінію)* і бяруцца за рукі. Злоўлены "кошкай" ці той, хто стаў на лінію апошнім, выбывае з гульні. "Кошка" ўводзіць яго ў "дом". Ідзе змена "кошкі". Гульня пачынаецца зноў і заканчваецца, калі "кошка" ўсіх адвядзе ў "дом".



“ПАБЕЛКА”
(моладзі)

У гульні ўдзельнічаюць усе жадаючыя. Трэба выбраць заснежаную пляцоуку. Робяць са снегу вялікі камяк. Становяцца вакол яго, узяўшыся за рукі. Па сігналу вядучага кожны з гуляючых, упіраючыся нагамі, стараецца штурхнуць таго, хто стаіць побач, на снежны камяк. Як толькі хто-небудзь “пабеліцца” (г. зн. на адзенні застанецца след ад снегу), ён выбывае з гульні (ці аддае свой фант). Гульня працягваецца. Калі застануцца двое, хто каго зацягне на снежны камяк — той пераможца. Фанты выкупляюцца праз пацешкі.

“ЗОЛАТА”

Дзеці і нават дарослыя хлопцы і дзяўчаты часта гуляюць у гэтую гульню, сабраўшыся дзе-небудзь у хаце, а ў цёплае надвор’е — на двары ў каго-небудзь.

Адзін з удзельпікаў гульні бярэ пярсцёнак (так званае золата) і стараецца непрыкметна пакласці яго каму-небудзь у рукі. Пры гэтым гаворыць: “З кута іду, золата нясу, адгадайце, баяры, дзе золата ўпала. На куце ў палІцы, у красным, у ясным, у няшчасным”. Хто-небудзь з удзельнікаў гульні адгадвае, каму пакладзена “золата”. Калі не адгадае, усе над ім пачынаюць смяяцца, і ён будзе адгадваць да таго часу, пакуль не адгадае. Пасля кожнай няўдачы ў адгадванні пярсцёнак перахоўваецца.

“БЛІН”
(гульня з гледачамі)

Гульня — сюрпрыз. У вядучага вялікі жоўценькі папяровы блін з літарамі, у якім схаваны падарункі на



кожную літарку. Напрыклад: літара "Б" — буквар, байка, бурак. "Л" — літр малака, "І" — ірыска, ідэал (партрэт артыста), "Н" — навалочка, намітка, напарстак. Той, хто здагадаецца адразу, атрымлівае прыз.

ГРОДЗЕНСКІ СЛУП — "ПАДКАВЫРКА"
(мужчынам)

На адлегласці пяці метраў адзін ад аднаго ў зямлю ўкопваюцца два слупы 8—10 метраў вышынёй. Праз вертыкальныя проразі на вяршынях абодвух слупоў прапускаецца вяроўка. Ля падножжа аднаго слупа (меншага) вяроўка мацуецца цвікамі. На вяршыню большага слупа прымацоўваецца прыз. Вядучы гульні трымае канец вяроўкі ля меншага слупа, крыху апускае прыз. Удзельнік гульні імкнецца залезці на вялікі слуп, каб атрымаць прыз. Але той падымаецца вышэй і вышэй. Атрымлівае яго самы спрытны і дужы. Гульня стварае камічныя сітуацыі і збірае многа гледачоў.

"У КАРАГОДЗЕ МЫ БЫЛІ"
(дарослым)

Хлопцы і дзяўчаты бяруцца за рукі і становяцца ў круг. У сярэдзіне яго адна пара, на шыі абодвух нізка абаранкаў. Удзельнікі карагода рухаюцца вакол іх, спяваючы такія словы, дзе кожны радок паўтараецца 2 разы:

- У карагодзе мы былі, Ай, люлі, мы былі.
- Каго вы там відзелі? Ай, люлі, відзелі!
- Мы відзелі парачку. Ай, люлі, парачку.
- Ванечку і Валечку (ці) Волечку і Вовачку?
- Ты, парачка, патанцуй! Ай, люлі, патанцуй. (Пара,



патанцаваўшы, цалуецца).

Іх месца займае другая. Гульня-карагод працягваецца, пакуль выклікае цікавасць у моладзі.

Гульневы падворак масленіцы на свяце павінен быць самы вясёлы. Таму гульні падбіраюцца на ўсе ўзроставыя катэгорыі насельніцтва. Бо—

Згінулі сцюжы, маразы, мяцеліцы,
Болей не мёрзне душа ні адна.
Сонейкам цёплым, зеленню вабнаю
Абдаравала зямельку вясна.
Грай жа, жалеечка! Грай, грай, вясёлая!
Выйграй з вясною і долечку мне.

* Сакавік часамі снегам сее, а часамі сонцам грэе.

* Сакавік зялёны — ураджай благі

* Як у сакавіку туман, дык у жніво дождж — пан!

* У сакавіку зіма не гніе — у красавіку трава не расце.

* Няма ў сакавіку вады — няма ў красавіку травы.

* Сакавік дрэвам сок пускае.

* Сакавік мокры — хлеб горкі.

* Хто сее гарох у марцы, той гатуе ў гарцы, а хто ў маі, той ў яі.

* Жыта ў сакавіку глядзіць у неба — не пакаштуеш зімой хлеба.

* Сакавік дажджом імжыцца — хлеба будзе ў рукавіцу.

(З народных прыкмет).




Летам



Калыханкі-забаўлянкі



Баю-баю, дзецітка.
Пасні, дзецітка, пасні,
У Бога шчасця папрасі.
Божа шчасціца даець,
Цябе ў люленьку кладзець.

***

Спі, дачушка мая, спі
Ды аб долі шчаснай сні.
Маці будзе калыхаці,
Будзе песеньку спяваці.
Расце ў жыце кветка,
Кветка-васілёчак.
Расце маё дзіцятка
У ясненькі дзянёчак.

***

Жыта зжалі, кветка звяла.
Па дзянёчку змрок.
Адыздзі ты, доля злая,
Ад майго дзіцяці ўбок.

***

Люлі-люлі-люлі,
Усе дзеткі паснулі.
Адна мая ляля



Не спіць, не гуляець.
З катком размаўляець.

***

Люлі-люлі, малое,
А на лета — другое.
Люлі-люлі, Несцерка,
А налета — шэсцерка.
Люлі-люлі, Петрачок,
А налета — сем дачок.
Адна будзе нянька,
А другая — лялька.

ГУЛЬНІ ДЛЯ ДАРОСЛЫХ
“ЖУРАВЕЛЬ”

Гэта танец-гульня. Яго выканаўцы павольна падымаюць то правую, то левую нагу, імітуючы ўсёй пластыкай свайго цела жураўля. Некалькі пар, узяўшыся за рукі, утвараюць круг. У цэнтры яго ходзіць хлопец — “журавель”. У час, калі пары кружацца, ён падкрадаецца да дзяўчат і стараецца вырваць якую-небудзь з рук кавалера. А кавалер са сваёй дзяўчынай спрытна выкручваюцца. У час танца дзяўчаты спяваюць:

Да ўнадзіўся журавель
Да да нашых канапель:
Такі-такі журавель,
Што не выгнаць яго нігдзель.
Такі-такі чубаты,
Такі-такі насаты!

Нарэшце, калі дзяўчаты закрычаць: “Хапай, журавель!”— ён павінен схапіць каго-небудзь з іх за руку і станцаваць з ёю адзін круг. Калі ж нікога не схопіць — зноў застаецца ў крузе



за жураўля. У выпадку, калі яму пашанцуе, яго месца займае той, хто застаўся без пары.

“ГОРЛІЦА”

Гэты танец-гульня падобны да “Жураўля”, толькі ў крузе ходзіць не хлопец, а дзяўчына. З завязанымі вачамі яна павінна паказаць на хлопца. Калі ж яна пакажа на дзяўчыну, то павінна пацалаваць хлопца, які быў з той у пары. У час танца хлопцы пяюць:

Ой, дзяўчына-горліца
Ды да хлопцаў горнецца,
А хлапчына, як арол,
Як пабачыў, ажно ўмёр!

Гэтым танцам звычайна заканчваецца вечар адпачынку.

“КАРАГОД”

У гэтай гульні дзяўчаты становяцца ў свой круг, а хлопцы — у свой. Кругі павінны стаяць адзін у другім. Пад музыку песні С. Палонскага “Карагод” дзяўчаты рухаюцца ў адзін бок, а хлопцы — у адваротны. Хлопцы пяюць:

Ідзе, ідзе карагод, карагод,
Усе дзевачкі напярод, напярод.

Дзяўчаты:

А хлопчыкі за намі,
Міргаючы вачамі.

Усе разам:

Ото ж карагод,
Ото ж ваявод.

Дзяўчаты:

У нашага карагода
Быў сын ваявода.

Хлопцы:



У нашага карагода
Быў сын ваявода.

Усе разам:

Ото ж карагод,
Ото ж ваявод.

Музыка змаўкае па знаку вядучага, пасля чаго кожны хлопец павінны знайсці сваю дзяўчыну, стаць ля яе і ўзяць за левую руку. Вядучы, які не мае пары, становіцца ля адной з дзяўчат. Той хлопец, які застаўся без пары, выконвае заданне вядучага *(спявае, чытае вершы, танцуе і г. д.)*.

"ПАЛЕСКІЯ ПАСТУШКІ"

У гульні ўдзельнічаюць 2 чалавекі. Патрэбна мець 2 каўпакі з тканіны, якія надзяваюць на галовы, у левыя рукі ім даюць пугі. Па знаку вядучага ўдзельнікі павінны зняць адзін з другога каўпак правай рукой, а левую руку з пугай трымаць за спіною. Каму ўдасца раней атрымаць тры ачкі, гэта значыць тры разы зняць каўпак, той і выйдзе пераможцам.

"СЛУЦКІЯ ПАЯСЫ"

Двум удзельнікам вядучы дае саматканы пояс даўжынёю 6 метраў. Яны бяруць пояс за канцы, а вядучы трымае яго пасярэдзіне. Па знаку вядучага пад хуткую музыку ўдзельнікі накручваюць на сябе пояс, а калі дойдуць да сярэдзіны, тут жа пачынаюць раскручвацца. Раскруціўшыся, трэба адной рукой узяць пояс за канец, а другую падняць угору. Пераможцам лічыцца той, хто хутчэй справіцца з заданнем.

"ГЭТА ПОЛЕ ЖОЎТАЕ — НАШТО МНЕ"

Адзін з хлопцаў ходзіць у сярэдзіне карагода, усе пяюць:

Гэта поле жоўтае— нашто мне,



Я пайду да мілае да свае,
Там поле зялёнае — гэта маё.

Затым хлопец бярэ дзяўчыну, якая яму падабаецца, за рукі і выводзіць на сярэдзіну карагода з песняй:

Мая міленька харашэнька,
Бела, красна і румяна,
Яе лічанька малявана.
Я буду з мілаю
Мёд-віно піць
І поле дзяліць.

Гульня працягваецца да таго часу, пакуль кожны хлопец не падбярэ сабе пары.

"ПАДУШАЧКА"

Дзяўчаты становяцца ў круг, а адна з іх становіцца ў цэнтры і спявае:

Падушачка, падушачка мая пухавая!
Малодачка, малодачка мая маладая!
Каго люблю, каго люблю, таго й пацалую,
Падушачку пухавую таму й падарую!
Быў-жыў, ды няма, ды паехаў да лігіна,
Бедная мая галованька — адна спаці легла!
Жыў-быў, ды няма, ды паехаў на рэчку,
Каб ведала, што ўтапіўся, паставіла б свечку.
Ой, жаль жа мне, што не вернецца,
Падушачка пухавая перавернецца!

Дзяўчаты ёй падпяваюць і плаўна танцуюць укругавую то пагойдваючыся, то б'ючы ў ладкі. Пасля песні дзяўчына, што стаяла ў крузе, выбірае сабе сяброўку і пачынае танцаваць "круцёлку". Тое ж робяць і ўсе астатнія. Патанцаваўшы, у сярэдзіну круга становіцца дзяўчына, што



танцавала з вядучай, і гульня працягваецца.

“КАСАРЫ”

Для гульні патрэбны 2 “касы”, 10 цурак, 2 саматканыя кашулі, 2 саламяныя капелюшы.

Дзве каманды па 6 чалавек становяцца ў калоны па аднаму, адна ад другой на 3 метры. Па знаку вядучага першыя нумары надзяваюць кашулі, капелюшы, бяруць “косы” і “косяць” цуркі, расстаўленыя к гэтаму часу астатнімі нумарамі.

Пераможнае ачко атрымлівае той удзельнік, які лепш сыграе касара.

Перамагае тая каманда, удзельнікі якой набяруць большую колькасць ачкоў.

“ЛІСКІ”

“Ліска” — невялікі па памерах прадмет — павінна быць у кожнага ўдзельніка. У гульні можа ўдзельнічаць ад 6-ці да 20-ці чалавек.

Удзельнікі па дамоўленасці або жараб’ёўкай выбіраюць вядучага — “ліса” і, стаўшы ў круг дыяметрам 10—20 м, кладуць каля сябе “лісак”.

“Ліс” падыходзіць да аднаго з удзельнікаў, і паміж імі адбываецца наступны дыялог:

— Дзе быў?

— У лесе.

— Каго злавіў?

— Ліску.

— Аддай ліску маю!

— За так не аддаю.



— За што аддасі, скажы сам.

— Калі абгоніш, тады аддам.

Пасля гэтага "ліс" бяжыць улева (управа) па-за кругам, а гаспадар "ліскі" — у працілеглы бок. Гаспадаром "ліскі" становіцца той, хто зойме свабоднае месца ў крузе, "лісам" — удзельнік гульні, які адстаў. Бегчы дазваляецца толькі па-за кругам.

"ЧАРАДЗЕЙ"

Гульня праводзіцца ў зале пры ўдзеле любой колькасці чалавек. Для гульні патрэбен невялікі прадмет (мячык, шарык, кветка і т. п.) — "чарадзей".

Удзельнікі становяцца ў круг на адлегласці 1,5—2 м адзін ад аднаго і перакідваюць "чарадзея" адзін другому. Калі "чарадзей" упадзе на зямлю, усе павінны "замерці" і стаяць да таго часу, пакуль хто-небудзь не парушыць маўчанне (павернецца, засмяецца і г. д.). За гэта ён атрымлівае штрафное ачко, і гульня пачынаецца спачатку. Тыя, хто атрымаў па тры штрафныя ачкі, выбываюць з гульні. Перамагае ўдзельніік, які застаўся апошнім у крузе. Пры вялікай колькасці ўдзельнікаў з гульні выбываюць пасля першага штрафнога ачка.

"ГАРАДЫ"

Гульня праводзіцца ў зале, дзе ёсць месцы для сядзення. Колькасць удзельнікаў неабмежаваная.

Па дамоўленасці выбіраюць вядучага-адгадчыка, які выходзіць у суседні пакой або адыходзіць у бок. Затым кожны ўдзельнік для сябе выбірае назву якога-небудзь горада, усе садзяцца і клічуць адгадчыка. Калі ён прыходзіць, яму



гавораць:

Гарадоў прыгожых многа,
Ты знайдзі да іх дарогу,
Лепшы горад выбірай
Ды хутчэй называй!

Адгадчык адгадвае тры разы (можна адзін) і, калі адгадае, мяняецца месцам з тым удзельнікам гульні, які загадаў назву горада. Калі не адгадае, яму гавораць:

— Ну і ад'язджай у свой (указваецца назва апошняга горада, названага адгадчыкам).

Адгадчык выходзіць, удзельнікі выбіраюць сабе назвы іншых гарадоў, і гульня паўтараецца.

Можна выбіраць назвы гарадоў адной краіны, рэспублікі або вобласці, аб чым да пачатку гульні паведамляецца адгадчыку.

"ЗАЧЭП"

"Зачэп" — старажытная беларуская гульня, у якой удзельнічаюць 2 чалавекі. Для гульні патрэбны стол. Удзельнікі, седзячы або стоячы адзін супраць другога за сталом, фалангамі сярэдніх пальцаў правай (левай) рукі стараюцца перацягнуць партнёра. Другой рукой яны ўпіраюцца ў стол.

Прайграе той, хто першы разагне палец.

"ПЕРАЦЯГНІ"

Двое ўдзельнікаў, узяўшыся правымі рукамі за паясы, цягнуць адзін другога ў процілеглыя бакі, стараючыся дацягнуцца левай рукой да кеглі, што стаіць на адлегласці 3-х м ад кожнага.

Хто з трох разоў дацягнецца да кеглі, той лічыцца



пераможцам.

“ПАЦЯГ”

У гульні можа ўдзельнічаць ад 8-і да 20-і чалавек. Удзельнікі дзеляцца на дзве роўныя па сіле каманды, якія становяцца ў шарэнгі на адной лініі (наперадзе — мацнейшыя, ззаду— слабейшыя). Затым усе захопліваюць адзін аднаго сагнутымі ў локцях рукамі. Паміж камандамі на падлогу кладзецца невялікі прадмет — “мета”. Пасля гэтага першыя ігракі каманд, стоячы над “метай”, такім жа чынам захопліваюць адзін аднаго, і каманды пачынаюць павольна цягнуць кожная ў свой бок.

Выйграе каманда, якая здолела разарваць ланцуг іншай каманды або перацягнуць яе цераз “мету”.

“ПРАРОК”

Колькасць удзельнікаў ад 8-і да 16-і чалавек. Па дамоўленасці выбіраюць “прарока” і вядучага, тайком паведамляюць вядучаму свае ўмоўныя імёны (ружа, фіялка, леў, гара, птушка, лебедзь і г. д.) і перадаюць свае жартоўныя пытанні, напрыклад: “Калі я стану чэмпіёнам свету?”, “Як навучыцца плаваць?”, “Калі мне купяць новы касцюм?”, “Калі пачнецца лета?” і г. д. Затым садзяць “прарока” пасярэдзіне пляцоўкі і накрываюць яго галаву хусткай.

Удзельнікі па чарзе падыходзяць да “прарока” і кладуць яму на плячо руку. Адначасова вядучы аб’яўляе ўмоўнае імя таго, хто падышоў, і яго пытанне. “Прарок” павінен з гумарам на яго адказаць.

Калі “прарок” любіць і ўмее дасціпна жартаваць, гульня заўсёды суправаджаецца вясёлым смехам.



“ПЕЎНІ”

У гульні ўдзельнічаюць 2 чалавекі (пажадана хлопцы). Яны сашчэпліваюць свае рукі за спіной, падгінаюць адну нагу і, скачучы на другой, штурхаюць праціўніка грудзьмі ці плячом. Той, хто страціць раўнавагу і стане на зямлю дзвюма нагамі, выбывае з гульні.

Правілы: 1. Пачынаць гульню можна толькі па камандзе. 2. У час гульні нельга пераскокваць з адной нагі на другую.

“МОСТ”

Дзяўчаты становяцца ў шарэнгу і бяруцца за рукі. Ад іх адыходзяць 2 дзяўчыны, становяцца тварам адна да адной і таксама бяруцца за рукі. Тыя, што стаяць у шарэнзе, пачынаюць спяваць:

Явар, явар, яваровы людзі!
Чаго вы тут стаіце, яваровы людзі?
Дзяўчаты, што аддзяліліся, у адказ ім пяюць:
Мы тут стаімо,
Мост падаімо!

Сяброўкі іх пачынаюць упрошваць (пяюць):

Явар, явар, яваровы людзі!
Прапусціце хутка праз масток.
Дзявочы дуэт адказвае ім:
Мы хутка прапускаем,
Адну сабе астаўляем.

Яны падымаюць рукі ўгору, і ўсе дзяўчаты праходзяць у іх пад рукамі, акрамя апошняй, якую яны затрымліваюць, рэзка апускаючы перад ёй рукі. Гульня працягваецца да той пары, пакуль не затрымаюць усіх дзяўчат. Затрыманыя



ўдзельнічаюць у спевах.

“У КАРАГОДЗЕ МЫ БЫЛІ”

Хлопцы і дзяўчаты бяруцца за рукі і ўтвараюць карагодны круг. У сярэдзіне яго ходзіць адна пара і прытанцоўвае, а астатнія рухаюцца вакол іх і спяваюць (кожны радок паўтараецца двойчы):

У карагодзе мы былі, Ай, люлі, былі мы.
Каго вы там відзелі, Ай, люлі, відзелі?
Мы відзелі парачку, Ай, люлі, парачку.
Ты, парачка, патанцуй, Ай, люлі, патанцуй.

Пара, станцаваўшы, выходзіць з карагоднага круга. Іх месца займае іншая пара, якая паўтарае тое ж самае.

ЗАГАДКІ

1. Вось вам быль-небыліца:
У пяці чалавек — адна паясніца?

2. Усё, што мае перадаць,
На твары ў яго відаць,
А язык у таго,
Хто глядзіць на яго.

3. Стаіць пястунчык —
За кожны глытунчык
Просіць пацалунчык.

4. Пухнатае ягнятка —
Хто ж падумаць мог!—
Днём яно з нагамі,



А ўначы без ног.

5. Пер'я наелася,
У кашулю адзелася
І спіць у ахвоту
Начная істота.
Ляжыць, дзе і ты,—
Чатыры рукі, два жываты.

6. Твой сябра блізкі:
Сядзіць — высокі,
А ўстане — нізкі.

7. Што за палена з ямай да калена?

8. Ну і дзіўны посуд
Носіш, браце, ты:
Дагары дном — поўны,
Дном уніз — пусты.

9. У якой малечы калені вышэй за плечы?

10. Між агуркамі, буракамі —
Каза з зялёнымі рагамі.

11. Дзве Аўсеевы Ганулі адну світку апранулі.

12. Чорных зубоў поўна пашча.
Частуе, частуе, а ты ўсё нашча.



13. Што за навінка:
Пад ёлкай вырасла сланінка?

14. Кішанёвая сякерка зашчамілася ў дзверках.

15. Драўляныя рукі
Цягаюць жалезныя лукаткі.
Другога катуюць,
А самі лямантуюць.

16. У кутку — барана на кійку.

17. Вясковы каптанчык, а ў ім — адуванчык.

18. У вясковай світцы полымя навязана на нітцы.

19. Глядзіць і ўдзень, і ўночы,
Вытарашчыўшы вочы,—
Ні на дварэ, ні ў хаце...
Як і называці?

20. Што гэта такое — сеў адзін, а ўсталі двое?

21. І нажом зразалі,
І дротам вязалі,
А ён не плача,
А па падлозе скача.

22. Фіту-міту, поўна шафа аксаміту.



23. На кургане, на вургане
Стаіць курачка з сяргамі.

24. Узойдзе Ягор на бугор — вышэй лесу, вышэй гор,
З бугра спускаецца — з вачэй хаваецца.

25. Нахмурыцца, насупіцца, у слёзы ўдарыцца —
Нічога не застанецца.

26. У гародзе летам цвіце жоўтым цветам,
Вышэй усіх узняцца рад,
Бо ён сонцу малодшы брат.

27. Сядзіць бабуся, сядзіць хатуся,
А хто забачыць, дык заплачыць.

28. Крутаста, вяртаста, на ёй сукань за ста,
Хто адгадае, той пажыве лет за ста.

29. Хоць і красна, ды не дзеўка,
Хоць з хвастом, ды не мыш.

30. Каля хаты ў садочку
Між зялёненькіх лісточкаў
Паглядзі: навідавоку
Шмат красунь чырвонашчокіх.
Хоць прывабна пазіраюць,
Сэрцы каменныя маюць.

31. На градзе агонь ірдзее,



Не пячэцца і не грэе.
Ён пахучы і прыгожы,
Нават дождж заліць не можа.
І з такіх агнёў-праменняў
Вараць смачнае варэнне.

32. Каціліся біруліцы па вуліцы,
Ускаціліся на двор,
Надуліся, як мех,
Белы сталі, як снег.

33. Прасіў цар царыцу да сябе на вячоркі, а яна кажа:
"На неба не гляджу,
Па зямлі не хаджу
Ды цябе не найду".

34. Што жанчына зробіць з гаршком, перш чым начне ў ім варыць абед?

35. Жыве без цела, гаворыць без языка, ніхто яго не бачыць, а кожны чуе.

36. Калматы, вусаты, есці пачынае, песенькі спявае.

37. Летам шэранькі, а зімой беленькі.

38. Не кравец, а ўсё жыццё з іголкамі ходзіць.

39. Не доктар, а дрэвы лечыць.



40. Усіх буджу, хоць без гадзінніка хаджу.

41. У чырвоных ботах па балоце ходзіць, жабак спрытна ловіць.

42. Доўгі насок, тонкі галасок, хто яго заб'е, той сваю кроў пралье.

43. Напхана пухам, ляжыць пад вухам.

44. Два браты ідуць у мора купацца.

45. Зубы вострыя мае, дробна жуе, а не глытае.

46. Сам драўляны, а галава жалезная.

47. Адным цветам і зімой і летам.

48. Па небе плавае, іскрыстае, рухавае, жыццё дае палеткам, і збажыне, і кветкам.

АДКАЗЫ

1. Рука і пальцы.
2. Пісьмо.
3. Шклянка.
4. Шарсцяная шкарпэтка.
5. Падушка.
6. Сабака.
7. Бот.
8. Шапка.



9. Камар.
10. Цыбуля.
11. Зярняткі аўса.
12. Сланечнік.
13. Грыб.
14. Ножык-складанчык.
15. Піла.
16. Мятла.
17. Свечка.
18. Свечка.
19. Вокны.
20. Чалавек і яго цень.
21. Венік.
22. Сажа ў коміне.
23. Авёс.
24. Сонца.
25. Навальніца.
26. Сланечнік.
27. Цыбуля.
28. Качан капусты.
29. Бурак.
30. Вішні.
31. Клубніка.
32. Гусі.
33. Рак і рыба.
34. Паглядзіць у яго.
35. Сумленне.
36. Кот.
37. Заяц.
38. Вожык.



39. Дзяцел.
40. Певень.
41. Бусел.
42. Камар.
43. Падушка.
44. Вёдры.
45. Піла.
46. Малаток.
47. Хваёвыя дрэвы.
48. Сонца.

БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ СКАРАГАВОРКІ

1. Добраму ўсюды добра. Добра ўсюды добраму.
2. Дудар дудару дарма грае.
3. Ехаў грэка цераз рэку. Бачыць грэка: у рэчцы рак. Сунуў грэка руку ў рэку, рак за руку грэку — цап!
4. З'еў маладзец трыццаць тры пірагі з пірагом ды ўсе з тварагом.
5. І Піліп да ліпы прыліп. Да ліпы прыліп і Піліп.
6. І тут гу-гу, і там гу-гу, і нічога разабраць не магу.
7. Каласы каласавалі, каласавалі, выкаласаваліся.
8. Лавіў рыбак судака, судзіў судак рыбака: лоўка, рыбак, ловіш, судаку сорам робіш.
9. Лезь, залезь, залезшы, злезь.
10. Лянок не любіць лянот. Лянот не любіць лянок.
11. Маша шыла шапку Сашу. Шапку Сашу шыла Маша.
12. Пабудзе ў вадзе і нямокры ідзе.
13. Ні налева, ні направа. Ні направа, ні налева.
14. Нясмелага з няўмелым не распазнаеш.
15. Пад вываратнямі вавёрка ўе вяроўкі вёртка.



16. Пётр Пятровіч, па прозвішчу Пятроў, злавіў птушку-пяюшку, панёс па рынку, прасіў палцінку, давалі пятак, дык аддаў і так.

17. Пісаў пісака, пісаў, перапісваў, ды так і не напісаў.

18. Санлівага не дабудзішся, лянівага не дашлешся.

19. Саша на шашы, смокчучы сушку, шагам шпарка шпарыла.

20. Слаўка і Саўка, ды не ў сваіх санках.

21. Спрытна кроп палоў Пракоп, лёг пад кропам і захроп.

22. Смешкі кошцы, слёзкі мышцы.

23. Твая маці і мая маці пяклі булкі ў адной хаце.

24. Ткач тчэ тканіну на хустку Антаніне.

25. У бубны бубнілі, бубнілі, панабубніваліся.

26. Усім па сем, гаспадару восем, а гаспадыні дзевяць, што добра дзеліць.

27. Фарсун фарсіў у фіялетавым фраку і фетравым капелюшы.

28. Чырвоная стужачка каля капялюшыка.

29. Як дурніцы не чарніцы, так чарніцы не дурніцы.

30. Як Якімка, так і Хімка, а як Хімка, так і Якімка.

ПРЫКАЗКІ І ПРЫМАЎКІ

Дзе ўлада народа, там шчасце і свабода.

Няма смачнейшай вадзіцы, як з роднай крыніцы.

Родная зямля мякчэйшая за чужую пярыну.

Радзіма — маці, умей за яе пастаяці.

Радзіма — матка, чужына — мачаха.

Там жыццё рай, дзе свабодны край.

Той патрыёт, хто змагаецца за народ.



Смелы і разумны два вякі жывуць.

Моцны статак чарадою, а людзі грамадою.

Рада з людзьмі ніколі не шкодзіць.

Там добрая дзея, дзе два аруць, а трэці сее.

Ідзі з людзьмі, то не згубішся.

У калектыве чыстая ніва і багатае жніва.

Згодаю двор збудуеш, а нязгодаю — гатовае разбурыш.

Дзе дружна, там хлебна.

Адна галавешка і ў печы не гарыць, а дзве і ў полі не гаснуць.

Адна ластаўка вясны не робіць.

Адзін дуб у полі — то не лес.

Адзін з'еш хоць вала — адна хвала, а як станеш з людзьмі есць — будзеш мець чэсць.

Хто ўлетку халадку шукае, той узімку галадае.

Сёння зробіш — заўтра як знойдзеш.

Хто летам позна спіць, той лета не бачыць.

Чалавек без працы, што птушка без крылаў.

Дзе шчырая праца — там густа, а дзе лянота — там пуста.

Зямля — талерка: што пакладзеш, тое і возьмеш.

Калі праца — асалода, жыццё — харaство.

Не таму слава, хто на язык лёгкі, а таму, хто ў справе стойкі.

Святочнаму дню — святочная праца.

У добрага трактарыста і трактар спявае.

Добра працуеш — павагу маеш. Бацьку любі, старых паважай, здароўе беражы, а калгаснае дабро сцеражы.

Сон назаўтра адкладзі, а справу сёння зрабі.

У добрых бацькоў добрыя дзеці.



Якая матка, такое і дзіцятка.

Не слухаў бацькі і маткі, дык людзі навучаць.

Не саромейся пытаць: больш спытаеш — больш пазнаеш.

Да чаго не дойдзеш, тое у кніжцы знойдзеш.

Бачыць вока далёка, а розум яшчэ далей.

Розуму і на кірмашы не купіш.

Добры чалавек і сабакі дражніць не будзе.

У добрага чалавека заўсёды многа добрых сяброў.

Добрае чуваць далёка, а благое яшчэ далей.

Добрая слава ў кошыку ляжыць, а благая па дарожцы бяжыць.

Як аб табе чуюць, так аб табе і мяркуюць.

Адзеўся, як пава, але дурная слава.

У вочы — "саколю", а за вочы — соллю.

Другі баран ні "бэ" ні "мя", а любіць гучнае імя.

Тады слова — серабро, калі справа — золата.

Лепш недагаварыць, чым перагаварыць.

Слухай многа, а гавары мала.

Няма тае хусты, каб завязаць людзям вусны.

Язык у разумнага ў галаве, у дурнога — на зубах.

Праўда грубая, ды людзям любая.

На праўдзе свет стаіць.

Не за сталом таварышы пазнаюцца — яны пазнаюцца ў бядзе.

Птушка моцная крыламі, а чалавек дружбай.

Ненадзейны друг страшней ядавітага ворага.

Хто ў бядзе не быў, той сапраўдных прыяцеляў не знае.

З свайго языка спусціш — на чужым не зловіш.

Жыццё пражыць — не песеньку спець.



З песні слова не выкінеш, а плачучы рота не паправіш.

Лішняя дабрата — дурнота.

Адзін добры вопыт важней сямі мудрых павучанняў.

Не капай на людзей ямы: сам у яе ўвалішся.

Да якіх прыстанеш, такі сам станеш.

Ліхая кампанія на ліха выведзе.

Калі не музыка, не бяры скрыпкі ў рукі.

Не рабі ліхога і не бойся нікога.

Не хваліся, план складаючы, а хваліся канчаючы.

Па калядах уначы трашчыць, а ўдзень плюшчыць.

Ад каляд не ідзе ў лад.

Як прыйдуць каляды — мужыкі мякіне рады, а як прыйдуць зажынкі — няма хлеба ні асьмінкі.

Прыйшлі калядкі — бліны ды аладкі.

Калядкі — добрыя святкі: пад'еў — ды на палаткі.

Пакінь сваё "дам" к калядам.

Прападай ты, пане, з калядою, аддай мой мех.

Ад каляд тры разы пяць — пастушкі ў поле ляцяць.

На Новы рок прыбудзе дня на зайчын скок.

ГУЛЬНІ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ І ПАДЛЕТКАЎ "БРАДНІК"

Гульня праводзіцца на пляцоўцы або ў спартыўнай зале. У ёй могуць удзельнічаць 6—20 чалавек.

Удзельнікі пры дапамозе лічылкі выбіраюць "рыбака" і завязваюць яму вочы. Затым, пляскаючы ў ладкі, ходзяць вакол "рыбака", а ён іх ловіць. Калі на шляху "рыбака" перашкода (сцяна, слуп, яма), дзеці гавораць яму: "Глыбока"; калі ён абыходзіць гэтую перашкоду — гавораць: "Мялей", а калі абыдзе — "Мелка" або "Чыстая вада".



Злавіўшы аднаго з удзельнікаў, "рыбак" павінен назваць яго імя. Калі адгадае, то злоўлены становіцца "рыбаком" і гульня пачынаецца спачатку, а калі не — дзеці крычаць: "Лягушку злавіў", і "рыбак" яго адпускае. У час гульні дзеці перамяшчаюцца толькі павольна.

"ПРОСА"

Гульню праводзяць на пляцоўцы або ў спартыўнай зале. Колькасць удзельнікаў не менш за 6 чалавек.

Па дамоўлепасці выбіраюць "гаспадара" (або "гаспадыню"), становяцца ў шарэнгу і бяруцца за рукі. "Гаспадар" праходзіць уздоўж шарэнгі, спыняецца каля аднаго з удзельнікаў і пачынае з ім дыялог:

— Прыходзь да мяне проса палоць.

— Не хачу.

— А кашу есці?

— Хоць зараз!

— Ах ты, гультай!

І ў гэты ж час бяжыць у любы канец шарэнгі. Адначасова і "гультай" бяжыць у тым жа напрамку, але за шарэнгай. Хто першы — "гаспадар" ці "гультай" — схопіць за руку апошняга ў шарэнзе, той становіцца з ім побач, а той, хто спозніцца,— займае месца "гаспадара".

Пасля слоў "Ах ты, гультай!" "гаспадар" можа зрабіць некалькі падманлівых рухаў (пакуль "гаспадар" не пабяжыць, "гультай" не мае права крануцца з месца).

"ІВАНКА"

"Іванка" — гэта лялька або іншы прадмет (мяч, кубік і г. д.). Колькасць удзельнікаў 10—20 чалавек.



На зямлі чэрцяць круг дыяметрам 5—6 м — "лес", а ў сярэдзіне круга квадрацік — "дом лесавіка". У квадрацік змяшчаюць "Іванку" і выбіраюць "лесавіка". Астатнія ўдзельнікі гульні — "лебедзі". "Лебедзі", залятаючы ў "лес", спрабуюць забраць "Іванку", а "лесавік" — злавіць "лебедзя" рукой або дакрануцца да яго галінкай. "Лебедзь", якому ўдасца вынесці з "лесу" "Іванку", сам становіцца "лесавіком", і гульня пачынаецца спачатку. Злоўленыя "лебедзі" выбываюць з гульні.

Гульня заканчваецца па жаданню ўдзельнікаў або калі будуць злоўлены ўсе "лебедзі".

"Лесавік" не мае права выходзіць з "лесу" і ўвесь час стаяць каля свайго "дому", а "лебедзь", падхапіўшы "Іванку",— перадаваць яго другім.

"КОНІКІ"

Колькасць удзельнікаў — 70-20 чалавек.

У сярэдзіне пляцоўкі чэрцяць круг такой велічыні, каб у ім свабодна маглі змясціцца ўсе ўдзельнікі гульні — "конікі". Затым выбіраюць "шпака" і становяцца ў круг.

"Шпак", скачучы на дзвюх нагах, пачынае лавіць "конікаў". Як толькі "шпак" выходзіць за межы круга, усе "конікі" павінны перамяшчацца таксама, як і ён, скачучы на дзвюх нагах. Калі "шпак" зловіць іграка, ён заводзіць яго ў круг, сам застаецца там жа, а злоўлены робіцца "шпаком". Новы "шпак" можа скакаць на аднон назе (правай або левай), і ўсе "конікі" таксама павінны перамяшчацца такім жа спосабам. "Конік" лічыцца злоўленым, калі "шпак" дакранецца да яго рукой. Гульня заканчваецца, калі ўсе збяруцца ў круг.



“ЖМУРКІ”

Колькасць удзельнікаў ад 3-х да 20-і чалавек. Выбіраецца вядучы — “жмурка” і месца, дзе ён павінен знаходзіцца,— “сценка” (ля сцяны дома, плота, дрэва і г. д.). “Жмурка” закрывае вочы далонямі, прыціскаецца лбом да “сценкі” і голасна дэкламуе:

Пчолка на кветцы,
Птаха на ветцы,
Рыба ў вадзе,
Хавайцеся — жмурка ідзе!

Усе хаваюцца, а “жмурка” пачынае шукаць іх. Заўважыўшы іграка, ён падбягае да “сценкі”, ударае па ёй рукой і называе імя знойдзенага.

Калі ігрок дабяжыць да “сценкі” раней за “жмурку”, то стукае ў “сценку”, гаворачы: “Коў за сябе!” Пасля гэтага ён не павінны ўмешвацца ў гульню.

Калі ўсе ігракі будуць знойдзены (“раскуюцца”), “жмуркай” становіцца першы, каго знапшоў і “закаваў” “жмурка”, і гульня працягваецца.

Перад начаткам гульні трэба вызначыць тэрыторыю, за межамі якой ігракі не павінны хавацца.

“ПТУШКА”

Колькасць удзельнікаў 10—50 чалавек. Яшчэ неабходна мець і “птушку” (каменьчык, манету, шышку і інш.).

Выбіраюць вядучага — “раздатчыка”, становяцца ў круг плячо да пляча, спіной унутр круга, і трымаюць за спіной складзеныя чашачкай далоні.

“Раздатчык” ходзіць у крузе, непрыкметна ўкладвае



каму-небудзь у далоні "птушку", становіцца ў цэнтры і гаворыць:

-"Дзверцы адчынены!".

Той, у каго знаходзіцца "птушка", бяжыць да "раздатчыка" і аддае яму "птушку". Ігракі, што стаяць побач, павінны затрымаць яго. Хто першы яго схопіць, той і становіцца "раздатчыкам". Калі гэта нікому не ўдаецца, "раздатчыкам" становіцца ігрок, які аддаў "птушку" "раздатчыку".

Іграка з "птушкай" можна лавіць да таго часу, пакуль ён не дакранецца да "раздатчыка".

"ПЛЁТАЧКА"

Колькасць удзельнікаў ад 8-і да 20-і чалавек. Выбіраюць "першага" і "расплятальніка". "Расплятальнік" адыходзіць убок і адварочваецца. Ігракі становяцца ў круг тварам да цэнтра і бяруцца за рукі. Пачынаючы з "першага", усе па чарзе злева направа пачынаюць "заплятацца" (пераступаць цераз рукі, паварочваюцца ў любым напрамку, пераносяць рукі над галавой і г. д., але расшчапляць рукі нельга). Калі "плётачка" спляцецца ў адзін клубок, клічуць "расплятальніка", які пачыпае яго расплятаць.

"Плётачка" — адна з найбольш вясёлых дзіцячых гульняў. "Заплятанне" і "расплятанне" "плётачкі", калі дзеці аказваюцца ў самых незвычайных, часам забаўных позах, заўсёды суправаджаецца жартамі і смехам. Аднак "заплятанне" і асабліва "расплятанне" павінна праходзіць асцярожна, каб пазбегнуць вывіхаў і расцяжэнняў сустаўных звязак.



“АРОЛ”

Гуляць можна на прасторнай пляцоўцы. Для гульні трэба мець валейбольны мяч. Колькасць ігракоў ад 4-х да 12-і чалавек.

Удзельнікі гульні (“паляўнічыя”) з дапамогай жараб’ёўкі выбіраюць вядучага (“арла”), а самі, адвольна перамяшчаючыся па пляцоўцы, перакідваюць адзін аднаму мяч, стараючыся выбраць зручны момант і злёгку ўдарыць мячом у спіну ці па нагах “арла”. Але падыходзіць да “арла” бліжэй як на 5—6 крокаў нельга. Калі “арол” набліжаецца да “паляўнічага”, у якога мяч, той уцякае або аддае мяч іншаму. Калі пры гэтым “арлу” ўдасца злавіць яго, ён выкідвае яго за межы пляцоўкі. Вяртае мяч у гульню “паляўнічы”, па віне якога мяч быў страчаны. “Паляўнічы”, якому ўдасца “падбіць” “арла”, мяняецца з ім ролямі.

“МЛЫН”

Для гульні трэба мець валейбольны або баскетбольны мяч. Колькасць удзельнікаў ад 3-х да 30-і чалавек.

Усе становяцца ў круг на адлегласці не менш чым 2 м адзін ад другога. Адзін з удзельнікаў атрымлівае мяч і перакідвае яго другому, той — трэцяму і г. д. Паступова хуткасць перадач узрастае. Удзельнік, які ўпусціў мяч ці кінуў яго няправільна, выбывае з гульні. Перамагае той, хто застанецца ў гульні апошнім.

Правілы: 1. Мяч можна кідаць любым спосабам. 2. Мяч лічыцца кінутым правільна толькі ў тым выпадку, калі ён дакранецца да жывата, грудзей, рукі ці галавы таго, каму ён адрасаваны. 3. Ігрок выбывае з гульні таксама і ў тым выпадку, калі ён дакрануўся да мяча, але не злавіў яго.



“ВЕРАБЕЙКІ”

Невялікія прадметы “верабейкі” (кубік, цурка, маленькі мячык) — неабходныя для гульні, у якой могуць удзельнічаць адначасова 2—3 чалавекі або столькі ж каманд.

На снезе чэрцяць па колькасці іракоў квадраты — “палі” размерам 2Х2 м і ўсталёўваюць там у любым парадку роўную колькасць “верабейкаў”. Затым кожны ігрок рыхтуе для сябе снежкі і становіцца за дзесяць крокаў ад квадрата. Па чарзе ігракі пачынаюць збіваць снежкамі “верабейкаў”. Перамагае той, хто першы выб’е іх са свайго “поля”.

“ПАДХВАТ”

Гульня праводзіцца на заснежаным схіле гары. Для гульні неабходна мець санкі, шышкі або іншыя невялікія прадметы. Колькасць удзельнікаў неабмежаваная.

На схіле ўздоўж накатанай каляіны раскладваюцца шышкі. З’язджаючы з гары, удзельнікі гульні на хаду падхопліваюць іх. Па колькасці сабраных шышак выяўляюць пераможцу. Пасля спуску кожны кладзе шышкі на месца.

“МАРОЗ”

Колькасць удзельнікаў 10—30 чалавек. Яны пры дапамозе ЛІЧЫЛКІ:

Ты зялёны,
Ты чырвоны,
Ты ў кажусе,
І ў цябе
Сіні нос —



Гэта ты
Марозка-Мароз!

Выбіраюць "мароза" і разбягаюцца па пляцоўцы. "Мароз" бяжыць за імі і стараецца дакрануцца да каго-небудзь рукой. Той, да каго ён дакрануўся, лічыцца "замарожаным" і павінен спыніцца і развесці рукі ў бакі. Іншыя ўдзельнікі могуць "размарозіць" яго, пляснуўшы рукой па плячы.

Гульня праводзіцца пэўны час. Пасля кожных 3—5 хвіл. выбіраецца новы "мароз". Перамагае "мароз", які здолее "замарозіць" большую колькасць удзельнікаў гульні.

"КАРОНА"

Гульню трэба праводзіць на заснежанай пляцоўцы. Удзельнічаюць 3 каманды па 2—4 чалавекі ў кожнай.

Лепяць снежную бабу і зверху надзяваюць ёй на галаву "карону" (наткнуты на палку скрутак саломы, банку ад кансерваў і г. д.), затым рыхтуюць снежкі, складваючы іх у тры кучкі за 7—8 крокаў ад бабы і на роўнай адлегласці адна ад другой. Потым жараб'ёўкай устанаўліваюць чарговасць і становяцца каля адной з кучак.

Першы з удзельнікаў кідае снежку ў "карону" і перабягае да наступнай кучкі снежак. Тое ж робіць другі, а затым трэці. Аднак кідаць снежку неабходна толькі ў той час, калі папярэдні ігрок перабягае на новае месца. Той, хто кінуць не паспее, пазбаўляецца чарговага кідка.

Гульня працягваецца да таго часу, пакуль адзін з удзельнікаў не саб'е "карону". Ён і лічыцца пераможцам.

"ГУСІ"



Удзельнікі гульні вылучаюць двух хлопчыкаў: адзін з іх— "воўк", другі — "гусак". Усе астатнія з'яўляюцца "гусямі", гаму гульня мае такую назву. "Гусі" становяцца адзін за другім і ўтвараюць доўгі ланцуг, у пачатку якога стаіць "гусак". Мэта "ваўка" ў тым, каб пералавіць усіх "гусей". "Гусак" жа стараецца перашкодзіць гэтаму. "Воўк" капае ямку. "Гусак", бачачы гэта, пытае ў "ваўка":

— Што ты робіш?

— Ямку капаю.

— Нашто яна?

— Гусей лавіць і хаваць.

— Якіх гусей?

— Што ў цябе за плячыма.

— За што?

— У маім агародзе авёс паелі.

— Абгарадзі.

"Воўк" адказвае: "Я есці хачу!" — і кідаецца на "гусей", але "гусак" абараняе іх. Перамагае той, хто мацнейшы фізічна і больш вёрткі. Калі ваўку не ўдасца схапіць "гуся", "гусак" дазваляе сваім "гусям" "шчыпаць" "ваўка". Калі ж "ваўку" ўдаецца пералавіць усіх "гусей", тая ж кара напаткае тады "гусака".

"У ДЗЕДА І БАБУ"

Удзельнікі выбіраюць "дзеда" і "бабу". "Дзед" садзіцца вярхом на палку, а "баба" са сваімі "дзецьмі" садзіцца на падлогу. "Дзеці" садзяцца ў рад адзін за адным, а "баба" за імі ззаду, і ўсе моцна трымаюць адзін аднаго пад пахі. "Дзед" пачынае аб'язджаць іх з песняй:

Еду, еду каля дзеда,

Еду, еду каля бабы,



Каля бабы, каля старэнькай!

Заязджае наперад, прыпыняецца і, стукаючы палкай, пытае:

— Ці ёсць хазяін у двары?

— А што табе?

— Свінні ў гародзе!

— Ну выгані, кумок!

— А ці дазволіце там рэпінку вырваць?

— Ды рві сабе, толькі выгані!

Тады "дзед" дакрапаецца ціхенька палкай да пляча хлопчыка, што сядзіць першым, і гаворыць: "Юсь, вон! Юсь вон! Мне пакіньце хоць адну!" Потым кідае палку, хапае яго за рукі і цягне да сябе. Астатнія стараюцца не аддаць. Калі "дзед" усё ж вырве гэтую "рэпінку", ён садзіць яе асобна, а сам зноў пачынае аб'язджаць тых, хто сядзіць, з той жа песняй. Яго зноў просяць выгнаць свіней з агарода.

— А ці дазволіце там рэпінку вырваць?

— А дзе ж ты тую падзеў?

— Ды вось ехаў я цераз масток, чорт ухапіў маю кабылку за хвасток, тады я яму рэпіну і кінуў!

— Ну, вырві сабе яшчэ!

"Дзед" пачынае цягнуць другога хлопчыка і, калі не зможа, то кліча на дапамогу таго, якога выцягнуў раней, і разам яны выцягваюць "рэпінку". Так працягваецца гульня да таго часу, пакуль "дзед" не перацягае ўсіх удзельнікаў, а таксама пакуль усе не пабудуць у ролях "дзеда" і "бабы".

"МАША"

Удзельнікі гульні становяцца ў круг, пасярэдзіне —



"Маша" з завязанымі вачыма. Усе разам прагаворваюць:

Маша, ты пацеха наша,
Ручкі злажы, на імя ўкажы.

"Маша" павінна ўхапіць каго-небудзь з круга і адгадаць, хто гэта. Калі адгадае, то той становіцца "Машай", а "Маша" становіцца ў круг.

"ПОШТА"

Кожны з удзельнікаў гульні выбірае сабе назву горада, і ўсе становяцца ў круг, не трымаючыся за рукі. Аднаму з ігракоў завязваюць вочы, ён выходзіць на сярэдзіну круга і называе два гарады, якія павінны памяняцца месцамі, ступаючы ціха, каб той, хто ловіць, не чуў, дзе яны перабягаюць, і не злавіў іх. Калі ж зловіць аднаго з перабежчыкаў, то становіцца на яго месца, а злоўленаму завязваюць вочы, і ён становіцца пасярэдзіне круга. Усе пачынаецца спачатку.

"У БАБУ-ЯГУ"

З удзельнікаў гульні выбіраюць "Бабу-Ягу". На зямлі праводзяць лінію. Усе стаяць па адзін бок лініі, а "Баба-Яга" — насупраць. Дзеці хорам прыпяваюць:

Бабы-Ёшкі не баюся,
Чапялой адбаранюся.

Потым бягуць насустрач "Бабе". "Баба-Яга" ловіць. Каго зловіць, той становіцца "Бабай-Ягой". Гульня працягваецца.

"РАГАДАН"

Усе жадаючыя прыняць удзел у гульні становяцца ў круг, і адзін з іх "загадвае":



Рагадан, рагадан,
На чатыры загадан.
Кацярынін нос
На пятнаццаць вёрст.
Шалдэ-Балдэ,
Бушмак барада!

Пры кожным слове ён паказвае на кожнага ўдзельніка па чарзе, і на каго выпадзе слова "барада", той пачынае лавіць астатніх, а яны ад яго ўцякаюць. Калі зловіць каго, задае яму пытанне:

— Чый ты?

— Цароў!

— Ну, памажы мне коней лавіць!

І пачынаюць лавіць удваіх, потым утраіх і г. д.

"КАЧКА"

Для гульні патрэбны тэнісны мяч ("качка"). Колькасць удзельнікаў 5—15 чалавек.

Чэрцяць круг дыяметрам 15—20 м і жараб'ёўкай выбіраюць вядучага ("паляўнічага"). "Паляўнічы" становіцца ў цэнтры круга, астатнія — у любым яго месцы. "Паляўнічы" кідае "качку" ўгору і называе імя аднаго з удзельнікаў. Названы ігрок павінен злавіць "качку", тады ён стане "паляўнічым". Калі гэта яму не ўдаецца, ён павінен з таго месца, дзе ўпала "качка", папасці ёй у аднаго з ігракоў, што перамяшчаюцца па крузе, і толькі тады становіцца "паляўнічым". Ігрок, у якога ён папаў "качкай", выбывае з гульні. Але калі "паляўнічы" прамахнецца, з гульні выбывае ён сам.

Пераможцам лічыцца той, хто застанецца ў гульні апошнім.



Правіла. Калі мяч выкаціцца за межы круга, ігрок, якому ён быў адрасаваны, можа зрабіць з месца прыпынку мяча 2 крокі ў любым напрамку.

"Кольцы"

Гуляць можна на ўзлеску або адкрытай пляцоўцы. Для гульні трэба мець 20 звязаных з лазы кольцаў дыяметрам 20-30 см. Адначасова могуць гуляць 2 чалавекі.

У цэнтры ўбіваюць 2 калочкі. Ігракі становяцца на адлегласці 3—6 м ад калочкаў і накідваюць на іх кольцы. Тыя кольцы, якія не трапілі на калочкі, дазваляецца накідваць яшчэ раз. Так робіцца да таго часу, пакуль усе кольцы не будуць накінуты на калочкі. Пасля гэтага падлічваюць, колькі кольцаў на калочку ў кожнага ігрока. Выйграе той, у каго іх больш.

"ПАДСЕЧКА"

Для гульні патрэбны 1 тэнісны мячык. Колькасць удзельнікаў 8—15 чалавек. Яны выбіраюць вядучага ("рыбака"), які прысядае і кладзе перад сабой мячык. Астатнія становяцца паўколам каля мяча. "Рыбак" гаворыць некалькі разоў:

— Клюе, клюе, клюе... — і нечакана называе імя аднаго з удзельнікаў.

Усе ўцякаюць, а той, каго ён назваў, павінны схапіць мяч і кінуць яго ў каго-небудзь з ігракоў. Калі пападзе ("падсячэ"), то "падсечаны" выбывав з гульні, а калі не пападзе — выбывае з гульні сам.

Апошні ігрок падкідвае мяч уверх і ўцякае. "Рыбак" імкнецца злавіць мяч і папасці ім у ігрока, які ўцякае. Калі пападзе, то застаецца "рыбаком" і на наступную гульню, а не пападзе — "рыбаком" становіцца апошні "непадсечаны"



ігрок.

“ПУШКА”

Гуляць можна на пляцоўцы або паляне. Для гульні патрэбны 1 біта і 10 гарадкоў (“пушак”). Адначасова гуляюць толькі 2 чалавекі. Яны праводзяць на зямлі 2 паралельныя лініі (“межы”) на адлегласці 10—15 м адна ад адной і становяцца каля іх.

Ігракі ўстанаўліваюць на сваіх “межах” у вертыкальным становішчы па адной “пушцы” і па чарзе кідаюць у іх біту. Збітую “пушку” забірае той, хто збіў яе, а на тое месца ставяць новую. Гульня заканчваецца, калі адзін з ігракоў збіў усе “пушкі” праціўніка.

Правілы: 1. “Пушка” лічыцца збітай, калі ўпадзе на бок. 2. Кідаючы біту, нельга пераступаць сваю “мяжу”.

“КЛЁК ДАРОЖНЫ”

“Клёк” — старадаўняя гульня пастухоў-падлеткаў, добра вядомая ў розных раёнах Беларусі. Гэта гульня развівае трапнасць і дакладнасць удару, вакамер, пачуццё прасторы і настойлівасць.

Гуляць можна на адкрытай пляцоўцы даўжынёй 80—100 м. Для гульні трэба мець палку і завостраную з абодвух бакоў цурачку (“клёк”) даўжынёй 10—12 см і таўшчынёй 3—4 см. Колькасць удзельнікаў 2—6 чалавек.

На пляцоўцы ля аднаго з яе бакоў і пасярэдзіне чэрцяць па 2 паралельныя лініі, якія абмяжоўваюць “балоты”, на адлегласці 2 м адна ад другой. Затым удзельнікі дамаўляюцца аб чарговасці ўдзелу ў гульні.

“Клёк” кладуць упоперак першай лініі. Ігрок б’е палкай па яго канцы і адзначае рысай месца, дзе ён упаў. Калі



падыдзе яго чарга, ён зноў адбівае "клёк" далей. Трапіўшы ў "балота", "клёк" лічыцца "завязнуўшым", а ігрок павінен пачынаць гульню спачатку.

Ігракі робяць па чарзе толькі па аднаму ўдару, прасоўваючыся кожны раз уперад да месца падзення "клёка". Выйграе той, чый "клёк" раней дасягне канца пляцоўкі.

"РАБОТНІКІ"

У гульні ўдзельнічаюць 8—20 чалавек. Выбіраюць вядучага — "майстра" і ўтвараюць круг. "Майстар" становіцца ў сярэдзіну круга і гаворыць:

Мы ўмелыя работнікі,
Аратыя і плотнікі,
Сена косім, будуем дом...

Што мы робім тапаром? — і указвае на аднаго з удзельнікаў, які павінен адказаць на гэта пытане. Пасля таго ён указвае на другога і хутка называе іншы інструмент. Пытанні "майстра" і адказы ўдзельнікаў гульні могуць быць прыкладна такія:

Пытанні

Тапаром?
Свярдзёлкам?
Касой?
Рубанкам?
Сярпом?
Нажом?

Адказы

Сячом
Свідруем
Косім



Стругаем
Жнём
Рэжам і г. д.

“КАШКА”

Для гульні патрэбна “лыжка” *(хустачка, шышка, галінка, каменьчык і да т. п.)*. Гуляць адначасова могуць ад 10-і да 40-а чалавек.

Удзельнікі выбіраюць вядучага *(“кашавара”)* і становяцца ў круг плячо да пляча тварам да цэнтра. “Кашавар”, бегаючы па-за кругам, непрыкметна падкідвае пад ногі каму-небудзь “лыжку”. Аббегшы пасля гэтага круг, ён падштурхоўвае іграка, якому падкінута “лыжка”, і гаворыць: “Вочы пратры — кашку вары!” Ігрок становіцца ў сярэдзіну круга, дзе павінен знаходзіцца да канца гульні, а “кашавар” падымае “лыжку” і працягвае гульню.

Калі ігрок заўважыць падкінутую яму “лыжку” да таго, як “кашавар” аббяжыць круг, ён падымае яе і сам становіцца “кашаварам”, а ранейшы “кашавар” займае яго месца.

Па меры таго як частка ігракоў адпраўляецца “варыць кашку”, круг звужаецца. Гульня заканчваецца, калі ў крузе застаецца не больш як 4 ігракі.

Заўвага. Ігракі ў крузе не маюць права азірацца.



Восенню





Загадкі Дзеда Кандрата



Кандрат Крапіва гуляў са словамі і пакінуў нам у спадчыну вершаваныя смешныя загадкі, з якіх можна скласці гульнёва-забаўляльныя праграмы.

Чуйце, хлопчыкі, дзяўчаткі!
Прапаную вам загадкі
Для гульні цікавай, новай –
Трэніроўкі разумоваай.
Як з людзьмі гамонім мы,
Чуюцца амонімы –
Словы двухаблічныя,
Не для ўсіх прывычныя.
Іх і разгадайце.

Розных бабак шмат на свеце,
Тры з іх добра я прымеціў:



Біў адну я малатком,
Еў другую з малаком,
А трэцяя бабка —
Карэньчык ды шапка.

БАБКА 1:
маленькае кавадла для кляпання касы.

БАБКА 2:
запяканка з бульбы.

БАБКА 3:
грыб-падбярозавік.

Хоць па словах і радня,
Між сабой яны не ладзяць:
Адна б'е, другая гладзіць.
Тая з маху як ударыць —
Аж зямля калоціцца;
Гэта варыць, гаспадарыць,
Аб усіх клапоціцца.

БАБА 1:
прылада для забівання паляў маста.

БАБА 2:
бабуля.

Слова вядомае. Што яно значыць,
Мне аж няёмка неяк тлумачыць.
Прыкладаў можна прывесці тут дзвесце:
Можна, напрыклад, галоўку есці.
Можна галоўку яшчэ пагладзіць,
А можна і малаціць;
Да чаго-небудзь можна прыладзіць,



І ў любы бок пакруціць.
Шмат што з галоўкаю можна зрабіць,
Можна ёй нават і ворага біць.

ГАЛОЎКА 1:
галоўка капусты, цыбулі.
ГАЛОЎКА 2:
памяньшальна-ласкальнае
да слова "галава".
ГАЛОЎКА 3:
галоўка лёну.
ГАЛОЎКА 4:
галоўка снарада.

Журавель лунае
Той, што крылы мае.
А другі, бяскрылы,
Напружвае сілы,
Каб дастаць вадзіцы
Слаўнай маладзіцы.
ЖУРАВЕЛЬ 1:
пералётная птушка.
ЖУРАВЕЛЬ 2:
прылада для даставання
вады з калодзежа.

Я касой траву кашу
У зялёным лузе.
А другую я нашу
Пастаянна ў пузе.
Трэцюю, я вам скажу,
Носіць мая дочка,
На чацвёртай я ляжу –
Грэюся ў пясочку.



КАСА 1:
сельскагаспадарчая прылада.
КАСА 2:
падстраўнікавая залоза, селязёнка.
КАСА 3:
жаночая прычоска.
КАСА 4:
вузкая, доўгая мель, звычайная пясчанка.

Узяў рубель, уціснуў воз,
Запрог кабылу і павёз –
Ну як кагось насмерць заб'ём.
Каб лепш дабіцца пэўнай мэты,
Мы б'ем рублём, але не гэтым.
РУБЕЛЬ 1:
тоўстая жэрдка, якой уціскаюць воз (сенам, саломай).
РУБЕЛЬ 2:
грашовая адзінка.

Калі я ў маладзік іду,
Заўсёды сумкі дзве кладу,
Але другую, не такую
Я ужо ніяк не намацую:
Яна схавана за сцяной.
СУМКА 1:
гаспадарчая сумка.
СУМКА 2:
сардэчная сумка (з анатоміі).

Ужываю я дзве солі,
Калі гэта мне да месца:
Без адной я - невясёлы,
Без другой абед не есца!
СОЛЬ 1:



нота.

СОЛЬ 2:

сталовая соль.

Мне цыганка варажыла -
Выцягала з мяне жылы.
Потым я сядзеў на ганку -
З апетытам еў "цыганку".

ЦЫГАНКА 1:

жанчына.

ЦЫГАНКА 2:

сорт яблык.

Грэбень шмат каму патрэбны:
І расчэсваць валасы,
І жывёле для красы,
І прывабліым жанчынам,
І завоблачным вяршыням,
Бурнай пеністай вадзе
І касматай барадзе.
Словам, дзе ні грабяні,
Усюды трэба грабяні.
Як жа, каб не памыліцца,
Іх раскласці па паліцах?

ГРЭБЕНЬ 1:

расчоска для валасоў.

ГРЭБЕНЬ 2:

грабеньчык на галаве птушкі.

ГРЭБЕНЬ 3:

зубчаты край чаго-небудзь.

ГРЭБЕНЬ 4:

грэбень хвалі.

НАРОД СПЯВАЕ ПРА СЯБЕ

Прыпеўкі, якія могуць быць у гульнёвых праграмах,



складзеныя жыхарамі Беларусі і дасланыя ў рэдакцыю газеты "Звязда" на конкурс прыпевак.

У фальклорную скарбніцу
Рад бы ўнесці хоць драбніцу,
Захаваць ад забыцця
Рысы нашага жыцця.
Дзедаў К.

Стук-стук-перастук
Моднымі абцасамі.
Стаў музеем магазін
З добрымі каўбасамі.
Палікарпаў І.

Сядзіць бабка, хоча снедаць,
Ды не знае, што рабіць.
Можа, здаць ў арэнду дзеда
Ды батон сабе купіць?
Гідлеўская Р.

Прыляцела к нам з паклонам
Гаспажа Інфляцыя:
Сабірай, народ, мільёны,
Будзе прэзентацыя!
Буракоўскі У.

У гародзе парнікі,
Пад акном акацыя.
От, каб так раслі гуркі,
Як расце інфляцыя.
Стахейка Т.

Эй, бульбачка,
Куды мецішся?



На кантроль пападзеш -
Ну й засвецішся!

Эх, бульбачка,
Беларуская!
А гарэлкі як нагоняць,
Пішуць "Руская".

З неба зорачка упала
На сухі бульбяннік.
Любы, любы, ты мне любы
Як мядовы пранік.

Ох, лапці мае,
Чатыры аборкі!
Быў мядовы мой жаніх,
А мужык стаў горкі.

Ля кудлатае Яніны
Уюцца хлопцы, як вужы:
Бацька сотую машыну
Прыганяе з-за мяжы.

Я спяваю і танцую,
А вось замуж - аніяк,
Вінаваты мой татуля -
Не будуе асабняк.

З неба зорачка упала,
Дзе ўпала - ямачка.
Пусці замуж за Міхала,
Дарагая мамачка.

Не хадзіце, дзеўкі, замуж
За Міхала з Янкам.



А ідзіце за таго,
Хто кіруе банкам.

Не хадзіце дзеўкі, замуж
За Лявона-бульбаша,
Бо ў Лявона-бульбаша
Няма бульбы ні каша.

Мяне мілы не цалуе,
Бо баіцца СНІДу.
Вось вазьму, на злосць яму
За другога выйду.

Адзін хапнуў аж тры дачы,
Шчэ й даміну ў гарадку.
Другі есць свой хлеб жабрачы
У чужым сырым кутку.
Осіп М.

П'юць рабочыя, артысты,
Дэмакраты, камуністы,
Камерсанты і "бамжы"...
Божа, божа, сцеражы.
Доўнар Я.

***

Адам Русак
Засцілайце сталы,
Сталы новыя,
Сталы новыя
Ды дубовыя.
Засцілайце ж вы



Ды абрусамі
Саматканымі,
Вышыванымі.
Гэй вы, госцейкі,
Ды садзіцеся,
На вяселлі ў нас
Весяліцеся.
Ды пачосткаю
Пачастуйцеся,
Хараством маладых
Палюбуйцеся.

***

ПАЖАДАННІ

Жывіце здаровы, адзін аднаго любіце, паважайце. І нас не забывайце!

Каб жылі багата, як восень,
Каб былі красны, як вясна,
А дужыя, як вада.
Каб разам усё жыццё ішлі,
Шчасце-долю сабе знайшлі!

Дару падарунак на чатыры канты, каб было чатыры сыны, і ўсе - музыканты.

Рада маценька,
Што вяселле прычакала,
На гадзіначку
Ўсю радзіначку сабрала.

Дару запалкі, каб не было ў хаце сваркі.



Каб у вашай хаце
Заўсёды было што даці.

Да будзе з вамі вечная любоў.
Прайдзіце па жыцці,
Падаўшы адзін другому рукі,
Каб адступілі горкія разлукі -
Да будзе з вамі радасць першых дзён,
Пяшчотны трэпет першага спаткання
І ціхі шопат першага прызнання.
Ды будзе згода назаўжды
На ўсе шчаслівыя гады!

Адам Русак

ЗАСТОЛЬНАЯ

Ой, не п'ецца гарэлка,
Ой, не п'ецца віно.
Хто ж налье таго мёду,
Каб пілося яно?
Сярод нас маладыя
За вясельным сталом,
Павянчалася шчасце
Іх пад шлюбным вянком.
Не з гарэлкі мы п'яны,
П'яны мы не з віна —
Ап'янелі ад песень,
Ад гульні давідна.
Горка, горка гарэлка
За вясёлай гульбой,
Падсалодзяць нам чаркі
Малады з маладой.



Падсалодзяць тым шчасцем,
Што два сэрцы зліло,
Каб вясёлым, мядовым
Век жыццё іх было.

ВЯСЕЛЬНАЯ

А ў маладых нашых
Ды свяакоў шмат,
З кожнага калгаса
Ды па дзесяць хат.
Сталі ж маладыя
Нашы ад'язжаць,
На сваё вяселле
Радню запрашаць.
З'ехаліся госці
Зблізку, здалячынь,
З кожнага калгаса
Па дзесяць машын.
Ды паселі ж госці
За дзесяць сталоў,
А наш сват пачэсна
Ды парадак вёў.
Маладым з любоўю
Шчыраю дружыць,
Нам таго вяселля
Павек не забыць.

Зайграй, мая скрыпка, зайграй
Паважным гасцям на вяселлі,
Маладым, каб жылі, не старэлі,
Зайграй, мая скрыпка, зайграй.



ЛІСКІ

Па лічылцы выбіраецца водзячы — *ліс*. Дзеці ўтвараюць круг дыяметрам 10—12 м. Кожны кладзе перад сабой невялікі прадмет — ліску. Ліс падыходзіць да аднаго з удзельнікаў і пытаецца:

— *Дзе быў?*
— *У лесе.*
— *Каго злавіў?*
— *Ліску.*
— *Вярні мне ліску.*
— *За так не аддаю.*
— *За што аддасі, скажы сам.*
— *Калі абгоніш, тады дам!*

Пасля гэтых слоў абодва бягуць па кругу ў процілеглыя бакі. Гаспадаром ліскі становіцца той, хто зойме свабоднае месца ў крузе і возьме у рукі прадмет. Ролю ліса выконвае ўдзельнік, які адстаў.

Бегаць дазваляецца са знадворнага боку круга.

ПОШТА

Усе, хто гуляе, выбіраюць сабе назву беларускага горада ці сяла і становяцца ў круг, не трымаючыся за рукі. Аднаму з дзяцей завязваюць вочы, ён выходзщь на сярэдзіну круга і называе два гарады. Дзеці, якія маюць гэту назву, павінны памяняцца месцамі, перабегчы ціха, каб той, хто стаіць у крузе, не чуў, дзе перабягаюць, і не злавіў іх. Калі ён зловіць аднаго з тых, хто перабягае, то становіцца на яго месца. Злоўленаму завязваюць вочы, і ён становіцца ў сярэдзіну круга. Гульня пачынаецца зноў.

Дзіця, якое стаіць у цэнтры круга, павінна ведаць назвы гарадоў і сёлаў, што выбралі дзеці; мяняцца месцамі дзеці павінны, перабягаючы праз круг, а не са знадворнага боку яго.



КЛУБОК

Дзеці стаяць у крузе і гавораць нараспеў:

"Холадна стала, трэба ніткі матаць". Назначанае дзіця падыходзіць па чарзе да кожнага, кланяецца і запрашае ісці за сабой. Так працягваецца да таго часу, пакуль усе не стануць адзін за адным, узяушыся за рукі. Першы ў радзе пачынае рухацца па спіралі і вядзе за сабой астатніх. Так утвараецца вялікі клубок. Пасля гэтага першы ў радзе гаворыць:

— Холадна стала. Вось і гатовы наш клубок. Трэба цёплы шаль вязаць.

У гэты час клубок паступова размотваецца у доўгі ланцужок, і тады дзеці гавораць:

— Які доўгі і цёплы шаль атрымаўся.

Дзеці павінны моцна трымацца за рукі пры ўтварэнні клубка і пры размотванні яго ў доўгі ланцужок.

У ЛАПТУ

Удзельнікі дзеляцца на дзве каманды з роўнай колькасцю ігракоў. Кожная з іх выбірае сабе маці. На полі робяць ямачку — масла, куды кладуць шпуляк (мячык). Каманды становяцца насупраць. Першы ў шарэнзе ігрок адной з каманд б'е палкай шпуляк, і бяжыць да масла, удзельнік другой каманды імкнецца злавіць шпуляк і папасць ім у бягучага. Калі гэта яму ўдаецца, каманды мяняюцца месцамі.

Ігрок, адбіушы шпуляк, павшен бегчы да масла; той, хто злавіў шпуляк, кідае ім у бягучага, калі яму не ўдаецца папасці, ён на некаторы час выходзщь з гульні.

ПАСПЕЙ АДБІЦЬ

Усе дзеці рысуюць кругі і бяруць лапаткі (ракеткі). Адзін з іх застаецца без круга — гэта водзячы. Ён падкідвае



мяч, а дзеці адбіваюць яго, імкнучыся пры гэтым не выйсці са свайго круга, таму што водзячы можа яго заняць. Хто застаўся без круга, становщца водзячым, і гульня працягваецца.

Мяч павінен адбіваць той ігрок, над кругам якога ён пралятае.

ПАЛЯЎНІЧЫЯ І АРОЛ

З дапамогай жараб'ёўкі выбіраюць водзячага — арла. Усе дзеці — паляўнічыя, яны адвольна перамяшчаюцца на пляцоўцы, перакідваючы адзін аднаму мяч, і імкнуцца выбраць зручны момант, каб лёгка ўдарыць мячом у спіну ці па нагах арла. Але падыходзіць да арла бліжэй, чым пяць-шэсць крокаў, не дазваляецца. Калі арол набліжаецца да паляўнічага, у якога мяч, той уцякае або аддае мяч іншаму. Калі арол зловіць мяч на ляту, ён кідае яго за межы пляцоўкі. Вяртае мяч у гульню паляўнічы, па віне якога мяч быў злоўлены арлом. Паляўнічы, якому ўдаецца падбіць арла, мяняецца з ім ролямі.

Арол можа адабраць мяч у паляўнічага, дакрануўшыся да яго рукой.

ФІГУРЫ

Усе дзеці круцяцца ў крузе. Убаку стаяць воўк і маці.

Пасля слоў маці: "На месцы фігура замры!" — ігракі замірaюць у любой позе. Тады воўк выбірае фігуру, якая яму падабаецца, вядзе яе да маці і пытаецца, колькі яна каштуе. Маці гаворыць: "Два рублі". Воўк два разы б'е далоняй па далоні маці, фігура ў гэты час уцякае. Воўк яе ловіць. Калі зловіць, то гэта дзіця становіцца ваўком.

Воўк ловіць фігуру толькі тады, калі "выплаціць" за яе грошы.

ПРЭЛА-ГАРЭЛА



Да пачатку гульні выхавальнік у розных месцах пляцоўкі хавае цацкі. Дзеці становяцца ў круг і гавораць наступныя словы:

Прэла-гарэла,
За мора ляцела,
А як прыляцела,
Дзе-нідзе села.
Хто першы знойдзе,
Той сабе возьме.

Пасля гэтага яны разбягаюцца па пляцоўцы і шукаюць схаваныя цацкі.

Дзеці не павінны бачыць, куды выхавальнік хавае цацкі; пераможцам лічыцца той, хто больш іх знойдзе.

ПАЛЯЎНІЧЫ

Па лічылцы дзеці выбіраюць паляўнічага і двух-трох сабак. Усе астатнія — зайцы. Зайцы хаваюцца за кустамі, у ямах і іншых месцах. Выходзіць паляўнічы і крычыць: "Бах! Бах!" Сабакі бягуць ва ўсе бакі, знаходзяць зайцаў і выганяюць іх на адкрытае месца. Кожнага з дзяцей-зайцаў паляўнічы павінен сустрэць словамі: "Бах! Бах!" Інакш яны схаваюцца і іх трэба будзе шукаць зноў. Знойдзеныя зайцы павінны выйсці з гульні. Пераможцамі лічацца тыя зайцы, якіх паляўнічы на працягу 5 хвілін не знайшоў.

Дзеці-сабакі павінны шукаць дзяцей-зайцаў толькі пасля сігналу паляўнічага "Бах! Бах!"

КАЛІМ-БАМ-БА

Дзеці становяцца адзін супраць другога, утвараючы дзве шарэнгі. Дзеці кожнай шарэнгі бяруцца за рукі, паміж імі ідзе гаворка:

— Калім-бам-ба!
— На што слуга?
— Прышыць рукавы.



— На чые бакі?

— Пятае, дзесятае (імя) сюды. Названае дзіця бяжыць да другой шарэнгі і спрабуе разарваць яе. Калі дзіця зможа разарваць счэпленыя рукі, то вядзе ў сваю шарэнгу аднаго з ігракоў каманды праціўніка. Калі не разарве, застаецца ў шарэнзе праціўніка. Пераможцай лічыцца тая каманда, у якой у канцы гульні будзе найбольшая колькасць дзяцей.

Названае дзіця павінна разарваць счэпленыя рукі дзяцей другой шарэнгі, якія не маюць права пры набліжэнні ігрtoка раздымаць іх.

ГАРЛАЧЫК

Дзеці сядзяць у крузе на кукішках. Гэта гарлачыкі. Па кругу ходзіць пакупнік. Спыніўшыся каля каго-небудзь, ён пытаецца:

— Колькі каштуе гарлачык?

Дзіця адказвае:

За гарлачык гэты
Дай нам зусім крышку:
Каб ніколі не хварэць
— Маннай кашы лыжку.

Пасля гэтых слоў дзіця-гарлачык паднімаецца на ногі і бяжыць па кругу ў адным напрамку, а пакупнік — насустрач яму. Кожны імкнецца заняць свабоднае месца. Той хто спазняецца, становіцца пакупніком.

Дзеці павінны бегчы па кругу ў розных напрамках пасля слоў "...маннай кашы лыжку"; кожны з іх імкнецца заняць свабоднае месца.

Змяя

Дзеці строяцца ў калону па аднаму і бяруць рукамі за



пояс таго, хто стаіць спераду. Уся калона — змяя; першы ў калоне — галава, апошні - хвост.

Па сігналу выхавальніка галава павінна злавіць хвост, які ад яе ўцякае. Галава, што злавіла хвост, пераходзіць у канец калоны, і гульня паўтараецца.

Дзеці павінны моцна трымацца рукамі адзін за аднаго, стараючыся не разарваць калону; калі хвост ці галава адарваліся ў гульні, яны прайгралі і выходзяць з калоны.

ФАРБЫ

Дзеці выбіраюць гаспадара фарбаў і адгадчыка Несцерку. Усе астатнія — фарбы.

Несцерка адыходзіць убок, а гаспадар і фарбы ціхенька згаворваюцца, хто якой фарбай будзе. Назву фарбам можа даваць гаспадар, або кожны сам выбірае сабе які-небудзь колер (зялёны, чырвоны, белы і г. д.). Гаспадар павінен добра запомніць, хто якая фарба.

Калі назвы дадзены, фарбы і гаспадар прысядаюць на кукішкі і робяць выгляд, што засынаюць.

Тут да фарбаў падыходзіць Несцерка, тупае некалькі разоў нагой і гаворыць:

— Стук-стук!

Гаспадар прачынаецца і пытаецца:

— Хто тут?

— Несцерка!

— Чаго прыйшоў?

— Па фарбу!

— Па якую?

Несцерка называе які-небудзь колер, напрыклад:

— Па сінюю!

Калі такога колеру сярод фарбаў няма, гаспадар гаворыць:

— Такой фарбы ў нас няма! А ўсе фарбы пляскаюць у



ладкі і прыгаворваюць:

Пайдзі за сіненькі лясок,
Знайдзі сіні чабаток,
Панасі, панасі!
І нам прынясіі

Пасля гэтых слоў Несцерка адыходзіць убок, потым вяртаецца і працягвае з гаспадаром гутарку:

— Стук-стук!
— Хто там?
— Несцерка!
— Чаго прыйшоў?
— Па фарбу!
— Па якую?
— Па белую!

Калі белая фарба ёсць, гаспадар яму гаворыць:

— Ёсць белая фарба, бяры яе!

Фарба ўцякае, а Несцерка яе ловіць. Дзіця-фарба павінна бегчы ў загадзя абазначанае месца; злоўленая фарба наступны раз у гульні ўдзел не прымае.

А ці чулі, ці не чулі?
Што ў нас сягоння гулі!!!
З Кайданава і Стаўбцоў
Многа дзевак і хлапцоў.
І яшчэ со Слуцку,
Дзе гуляюць па-людску.
А таксама з Любані,
Што б гэта вы думалі?
І з дарог, што завуцца Старыя,
Дзе гуляюць вялікія і малыя.
І яшчэ з другіх мясцін,
Вясёлыя і гаманкія —
Усе, як адзін,
Якія гуляюць, але і справу знаюць.





Беларускія народныя пацешкі

Між намі кажучы

Праграма максімум: дасягнуць пражытачнага мінімуму.

Жанчына ведае, што гаворыць, гэта мужчына не ведае, што чуе.

***

Супрацоўнік звяртаецца да свайго загадчыка аддзела:

- Ці не можаце, Іван Пятровіч, дазволіць мне заўтра не прыходзіць на працу?

Жонка просіць, каб дапамог ёй управіцца ў пральні, сёе-тое падагнаць на дачным участку.

- На жаль, паважаны калега, не магу: гэта не прычына, каб адсутнічаць на службе.

- Шчыра дзякую вам, Іван Пятровіч,— узрадаваўся супрацоўнік. — Я так і ведаў, што вы будзеце на маім баку.

***

— Ой, у вас у хаце так брудна! — ускліквае суседка.

— Гэта ўсё зяць вінаваты, — тлумачыць цешча.

— Дык ён жа ў ад'ездзе...



— А вунь яго боты стаяць!

***

— Вам трэба быць вельмі асцярожным, — кажа лекар пасля агляду пацыента. — Не піць, не курыць, не танцаваць.

— І тады ў мяне будуць сілы абняць жонку?

— Ў лепшым выпадку, але толькі сваю.



***

Стэфанія пасля вяселля, калі ўсе госці паразыходзіліся, абдымае свайго мужа і кажа яму:

— Ты толькі ўяві сабе, Пятрусь, якое гэта шчасце, што мы цяпер жонка і муж! Цяпер мы ўжо не будзем апускаць шторы на вокнах!

***

Капітан далёкага плавання вярнуўся з працяглага марскога паходу. Па гэтай прычыне ўся сям'я сабралася за сталом.

—Гэта, напэўна, сынок Вова? — пытаецца капітан, паказваючы на хлопчыка.

— Так, — адказвае жонка, — гэта наш Вовачка. Помніш, ты тады вярнуўся з Ціхага акіяна?..

— А гэта Наташка?

— Наташка. Ты тады з Ледавітага акіяна прыехаў...

— А гэта хто сядзіць? — цікавіцца капітан.



— Ну сядзіць і сядзіць... Што ён табе, перашкаджае?

***

У судзе

Суддзя:

— Ці ведаеш, што красці гусей вельмі кепска?

Злодзей:

— Але, ведаю, пане суддзя! Бо яны надта ж моцна крычаць.

***

Ад чаго вецер

— Скажы, дзядзька, з чаго вецер робіцца?

— Як з чаго? Зірні ўгару, што там ёсць?

— Неба.

— А ўнізе?

— Зямля.

— А пасярэдзіне?

— Дый нічога!

— Дык вось вецер і дзьмухае, бо скразіць.

***

Сарамлівая

Зося: — Янка, аб чым ты гэта думаеш?

Янка: — Аб тым, аб чым і ты.

Зося: — Фу, як табе не сорамна!

***

Прысяга

— Ты што, здурнеў? П'еш гарэлку праз саломінку?

— Мушу трымаць слова. Я ж прысягнуў жонцы, што вусны мае не дакрануцца болей да чаркі.

***



“Трэба дома бываць часцей...”

(Сямейная хроніка)

— Дзе начаваў ты, маё гора? —
Пытае жонка ў Ягора. –
Дзе ночку цэлую бадзяўся?
Не пазваніў, не абазваўся!
— Такая драма з-за драбніцы!
Я быў у кума, у Ігната,
Ў яго цяпер пустая хата
(Ігната кінула Агата),
Ён начаваць адзін баіцца!
Ўздыхнуўшы, жонка да Ягора:
— Ідзі паеш, на працу скора.
...Ўсё ў гэтым свеце нетрывала.
І жонка дзесь заначавала.
У Ягора тое ж запытанне:
— Ну, дзе бадзялася да рання?
Я ноч не спаў ад хвалявання!
— Была ў сяброўкі я, у Ніны,
Гулялі ўчора імяніны,
Ісці дамоў адна баюся,
Не вінавата я, клянуся!
Муж аж зайшоўся:
— О, халера!
Збірай манаткі! Вон з кватэры!

***

У кватэру зайшла суседка, і маці кажа:
— Сынок, пацалуй цёцю.
— Баюся!
— Чаго?



— Аднойчы яе пацалаваў тата і атрымаў адразу ж аплявуху!

***

Маці выгаворвае сыну:

— І табе не сорамна? Зноў класны кіраўнік скардзіцца на твае паводзіны. Хоць браў бы прыклад з бацькі. За добрыя паводзіны яго датэрмінова вызваляюць з турмы!

***

Жонка мужу:

— Думаеш, я буду насіць гэтае футра з вавёркі ўсё жыццё?

Ён (бадзёра):

— А чаму б не, любая? Носяць жа вавёркі!

***

— І ў мяне быў некалі ідэал.

— Куды ж ён падзеўся?

— Я выйшла за яго замуж.

***

— Сабачае жыццё ў нас, мужчын! — кажа містэр Ален сваёй жонцы.

— Ды ўжо ж, — згадзілася місіс Ален. — Днём вы скуголіце, а ўсю ноч даяце храпака.

***

— Ну як, мілы, смачна? — пытае маладая жонка свайго мужа пасля першага прыгатавання абеду.

— Нядрэнна. Але ў наступны раз, любая, не забудзь да солі дадаць трошачкі супу.

***

Багаты халасцяк завяшчаў свае грошы тром



жанчынам, якія ў свой час адхілілі яго прапановы выйсці за яго замуж. “Я абавязаны ім мірам і шчасцем, — напісаў ён у завяшчанні, — якім я цешыўся ўсё жыццё”.

***

Да карчмы падыходзіць госць. Карчмар здалёк вітае яго:

— Добры дзень, Мікалаю! Вас тут пыталася нейкая жанчына.

— А хто ж такая?

— Ці ж я ведаю?

— Заікалася, можа?

— Але!

— Малая, крывыя абцасы?

— Але!

— Такая задрыпаная?

— Ага, ага.

— І лаялася?

— Ага.

— Гэта, пэўна, мая жонка.

***

Поп і шавец

Поп.

— Я такога дурня не бачыў, каб спачатку на кавалкі рэзаў, а потым іх зноў сшываў.

Шавец.

— А сустракалі вы, ойча, такога дурня, што, калі хто-небудзь памрэ і ўсе плачуць, ён адзін ідзе і спявае?

Наваражыла

— Ну, што табе цыганка наваражыла?



— Што хутка буду мець непрыемнасць.

— Не вер гэтаму.

— Дзіва, — не вер! Як толькі яна выйшла, я адразу ж спахапілася, што няма гадзінніка.

Знайшоў выйсце

У адной вёсцы жылі вельмі лянівыя муж і жонка. Гаспадыня спала на печы, гаспадар — на лаўцы, каля дзвярэй. Аднойчы раненька яна кажа:

— Стары, дождж на двары, ці што?

Той схапіў рукою кацюбу, што стаяла ў галавах, ударыў ёю аб дзверы, адчыніў іх і паклікаў:

— Бобік, Бобік!

Калі сабака стаў на парозе, ён і кажа жонцы:

— Відаць, няма дажджу, бо Бобік сухі.

***

— Вася, навошта вырываеш старонкі з падручніка? — пытае настаўніца.

— А я не ўсе вырываю, а толькі прачытаныя, каб памылкова не чытаць двойчы адно і тое ж.

***

— Мама, хто з нас старэйшы: я ці кот? Пытаецца Стасік.

— Вядома, ты!

— А чаму ён вусаты, а я — не?

***

Хвалько кажа хвальку:

— Чуў пра Атлантычны акіян?

— Чуў.

— Я яго пераплыў.

— А ты чуў пра Мёртвае мора?



— Чуў.

— Гэта я яго забіў.

***

Маці пытаецца ў сына:

— Чаму ты запрасіў на дзень нараджэння толькі гэтых двух хлопчыкаў?

— А яны не любяць торта, — адказаў сын.

***

Да хлопчыка, які плача, падышоў міліцыянер:

— Што здарылася?

— У мяне сабака прапаў.

— А якія ў яго прыкметы?

— Ён прапаў разам з прыкметамі.

***

Маці:

— Настаўніца спеваў паскардзілася, што ты заснуў на ўроку. Гэта праўда?

Сын:

— А што мне было рабіць, калі ўвесь клас спяваў калыханку.

***

Мама вядзе Мішу з цырульні. Уздоўж дарожкі, па якой яны ідуць, ляжаць галінкі, зрэзаныя з кустоў.

— Мама, чаму тут ляжаць галінкі?

— Гэта садоўнік падстрыг кусты.

Міша здзіўлена паглядзеў на маці і спытаў:

- У цырульні?

***

— Мне гэтыя цукеркі зусім не падабаюцца,— кажа Уладзік.



— Чаму ж ты іх ясі?

— А каб хутчэй скончыліся!

***

У суботу, калі Паўлік збіраўся ў школу, маці сказала:

— Вось атрымаеш сёння чацвёрку — паедзеш заўтра з татам на рыбалку. На цэлы дзень.

Прыйшоў Паўлік са школы і кажа:

— Мама, на рыбалку я паеду на паўдня.

***

Маленькі Гена ўбачыў на двары сабачку і пытае ў таты:

— Як завуць сабачку?

— Шарык.

— А чаму ён не круглы?

***

— Тата, пойдзем гуляць?

— Мокра на вуліцы, дождж пайшоў.

— А куды ён пайшоў?

***

Мама пытае ў чатырохгадовага сына:

— Алег, табе гэтыя туфелькі цесныя?

— Не, я проста пальцы зажмурыў.

***

— Бабуля, глянь, якія ў мяне кветкі.

— А дзе ж ты іх ўзяў?

— З твайго абруса.

***

— Што такое снягір? — спытала сястрычка.

Брат падумаў і адказаў:



— Гэта птушка са снегу.

***

— Дай мне тваю ручку, Віця.

— А чаму ты сваёй не пішаш?

— Яна шмат памылак робіць.

***

Бабуля кажа Марынцы:

— Хутка будзе дождж.

— Чаму?

— Куры на жэрдку паселі, прыкмета — на дождж.

— А ты іх згані,— параіла Марынка,— і дажджу не будзе.

***

— Раскажы, Толя, бабулі верш: ля ёлкі ты расказваў.

— Без ёлкі я не магу, забываюся.

***

— Паўлік, чаму ты кожны дзень спазняешся ў школу? Няўжо ў вас няма будзільніка?

— Будзільнік ёсць, ды толькі ён звоніць, калі я сплю.

***

— Віця, я спаткаў Ніну Пятроўну, яна зноў скардзілася, што дрэнна паводзіш сябе.

— І чаго яна скардзіцца? Я ж сёння зусім не быў у школе!



ЗМЕСТ

Гульнёвы ***падворак***

Зімою *6*

Вясною *46*

Летам *60*

Восенню *98*

Беларускія народныя пацешкі *117*



Выданне для вольнага часу

Кніжная серыя “Беларусь святочная”

Укладальнік **Клаўдзія Лукінічна Лабчэўская**

ГУЛЬНЁВЫ ПАДВОРАК

Рэдактар *Л.І. Жук*

Мастацка-тэхнічныя рэдактары *Ц.В. Дранчук, У.М. Жук*

Карэктар *А.В. Міронава*

Камп`ютэрны набор *С.В. Сухарукава*

Адказны за выпуск *Л.Ю. Свярдлоў*

Падпісана ў друк 21.11.2000 г. Фармат 60×84/16. Папера газетная. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 8,0. Тыраж 7000 экз. Заказ № 2866.

Падатковая ільгота - Агульнадзяржаўны класіфікатар Рэспублікі Беларусь АКРБ 007-98, ч.1; 22.11.20.600

Выдавецкае ТАА “Красіка-Прынт”. Ліцэнзія ЛВ № 84 ад 26.11.1997 г. 220072, г. Мінск, вул. Сурганава, 15.

Надрукавана з падрыхтаваных заказчыкам дыяпазітываў у друкарні выдавецтва “Беларускі Дом друку”. 220013, г.Мінск, пр-т Ф.Скарыны, 79.

ISBN 985-405-082-3